ISSN 1609–9672

# И З В Е С Т И Я

## Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины

№ 1 (94)
*Гуманитарные науки*

2016

Гомельский государственный университет
имени Ф. Скорины
# ИЗВЕСТИЯ

Журнал зарегистрирован в Министерстве информации Республики Беларусь
(свидетельство о регистрации
№ 1/87 от 18.11.2013 года)

Журнал включен ВАК Республики Беларусь
в перечень научных изданий Республики Беларусь,
в которых публикуются результаты
диссертационных исследований
(приказы № 207 от 13.12.2005, № 9 от 15.01.2010,
№ 57 от 16.05.2013)

Журнал включен в библиографические базы данных
ВИНИТИ и Научную электронную библиотеку
eLIBRARY.RU

**РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ**

**Главный редактор А.В. РОГАЧЁВ,** д-р хим. наук, профессор, член-корр. НАН Беларуси
**Зам. главн. редактора О.М. ДЕМИДЕНКО,** д-р тех. наук, профессор
**Зам. главн. редактора М.В. СЕЛЬКИН,** д-р физ.-мат. наук, профессор

**Члены редакционной коллегии:**

**Г.Г. Гончаренко,** д-р биол. наук, проф., чл.-кор. НАН Беларуси
**Ф.В. Кадол,** д-р пед. наук, проф.
**В.Н. Калмыков,** д-р филос. наук, проф.
**В.И. Коваль,** д-р филол. наук, проф.
**Г.Г. Лазько,** д-р ист. наук, проф.
**И.В. Семченко,** д-р физ.-мат. наук, проф.
**В.С. Смородин,** д-р тех. наук, проф.
**Б.В. Сорвиров,** д-р экон. наук, проф.
**В.М. Хомич,** д-р юрид. наук, проф.
**О.Г. Шляхтова,** ответственный секретарь

**Члены редакционной коллегии по гуманитарным наукам:**

**В.А. Дятлов (Украина),** д-р ист. наук, проф.
**А.И. Зеленков,** д-р филос. наук, проф.
**Ю.А. Лабынцев (Россия),** д-р филол. наук, проф.
**А.М. Литвин,** д-р ист. наук, проф.
**О.А. Макушников,** д-р ист. наук, проф.
**С.И. Михальченко (Россия),** д-р ист. наук, проф.
**А.А. Станкевич,** д-р филол. наук, проф.
**Г.П. Творонович-Севрук (Польша),** д-р филол. наук, проф.
**И.Ф. Штейнер,** д-р филол. наук, проф.
**Я.С. Яскевич,** д-р филос. наук, проф.

**АДРЕС РЕДАКЦИИ:**
**246019, Беларусь, Гомель, ул. Советская, 104,**
**Телефоны: +375 (232) 60-73-82**
**E-mail: vesti@gsu.by**
**Интернет-адрес: http://vesti.gsu.by**

Francisk Scorina Gomel State University
# PROCEEDINGS

The Journal is registered in the Ministry of Information of Republic of Belarus
(registration certificate
number 1/87 dated 18.11.2013)

The Journal is included in the Republic of Belarus Higher Attestation Commission list of scientific publications of the Republic of Belarus, which publish the main results for the degree of Doctor (Candidate) of Sciences
(order number 207 dated 13.12.2005, number 9 dated 15.01.2010, number 57 dated 16.05.2013)

The Journal is included in bibliographic databases of the All-Russia Institute of Scientific and Technical Information (VINITI), Scientific electronic library eLIBRARY.RU

**EDITORIAL BOARD**

**Editor-in-chief A.V. Rogachev,** Sc. D., Professor, Corresponding Member NASB
**Deputy editor-in-chief O.M. DEMIDENKO,** Sc. D., Professor
**Deputy editor-in-chief M.V. SELKIN,** Sc. D., Professor

**Members of editorial board:**

**G.G. Goncharenko,** Sc. D., Professor, Corresponding Member NASB
**F. V. Kadol,** Sc. D., Professor
**V.N. Kalmykov,** Sc. D., Professor
**V.I. Koval,** Sc. D., Professor
**G.G. Lazko,** Sc. D., Professor
**I.V. Semchenko,** Sc. D., Professor
**V.S. Smorodin,** Sc. D., Professor
**B.V. Sorvirov,** Sc. D., Professor
**V.M. Homich,** Sc. D., Professor
**O.G. Shlyahtova,** executive secretary

**Members of editorial board for the humanities:**

**V.A. Diatlov (Ukraine),** Sc. D., Professor
**A.I. Zelenkov,** Sc. D., Professor
**Y.A. Labyntsev (Russia),** Sc. D., Professor
**A.M. Litvin,** Sc. D., Professor
**O.A. Makushnikov,** Sc. D., Professor
**S.I. Mihalchenko (Russia),** Sc. D., Professor
**A.A. Stankevich,** Sc. D., Professor
**G.P. Tvoronovich-Sevruk (Poland),** Sc. D., Professor
**I.F. Shteiner,** Sc. D., Professor
**Y.S. Yaskevich,** Sc. D., Professor

**EDITORIAL OFFICE ADDRESS:**
**246019, Belarus, Gomel, Sovetskaya Str., 104,**
**Tel: +375 (232) 60-73-82**
**E-mail: vesti@gsu.by**
**Site: http://vesti.gsu.by**

© Известия Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины, 2016
© Proceedings of the F. Scorina Gomel State University, 2016

**Министерство образования Республики Беларусь**
**Учреждение образования**
**«Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины»**

# И З В Е С Т И Я

## Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины

**НАУЧНЫЙ И ПРОИЗВОДСТВЕННО-ПРАКТИЧЕСКИЙ ЖУРНАЛ**

Издается с 1999 г.
*Выходит 6 раз в год*

**• 2016, № 1 (94) •**
**ГУМАНИТАРНЫЕ НАУКИ: ИСТОРИЯ • ФИЛОЛОГИЯ • ФИЛОСОФИЯ**

## СОДЕРЖАНИЕ

### История

Барсук А.Я. *Палеміка М. Сматрыцкага як вызначэнне канфесійных супярэчнасцей у Рэчы Паспалітай* ..... 5
Горны А.С., Ільін А.Л. *Пінскі аддзел Беларускага кааператыўнага банка ў Вільні (1926–1932 гг.): утварэнне і дзейнасць* ..... 10
Жихарев С.Б. *Железнодорожное строительство в деятельности стародубского земства в 80-е гг. XIX в.* ..... 16
Костенко А.В. *Научное комплектование археологических фондов Херсонского музея: штрихи к интеллектуальной биографии В.И. Гошкевича* ..... 23
Кохановский А.Г. *Этнокультурная эмансипация белорусов на стыке эпох и культур (вторая половина XIX – начало XX вв.)* ..... 30
Селицкий В.С. *Государственно-политическое управление в начале Великой Отечественной войны на Гомельщине* ..... 37
Худаир Дахам Али. *Партия национального единства Ирака: идеология и внутренний Устав* . 43

### Филология

Кірушкіна М.І. *Сучасная жаночая паэзія Гомельшчыны* ..... 49
Красник А.В. *Сходства и отличия в структуре семантического и ассоциативного метеополей* ..... 54
Ничипорчик Е.В. *Функциональная связь оценки с элементами структуры ценностных ориентаций (на материале паремий)* ..... 59
Новік Г.Ю. *Дыферэнцыяльныя адметнасці аўтабіяграфічнай і дакументальна-мастацкай прозы* ..... 65
Паўлавец А.Д., Паўлавец Д.Д. *Лёс: слова і канцэпт (спроба лінгвакультуралагічнага аналізу)* ..... 69
Скоробогатая Т.И. *Словообразовательный потенциал глаголов физического воздействия в составе фазовых деривационных парадигм (на материале русского и немецкого языков)* ... 75
Станкевіч А.А. *Антанімічныя карэляцыі і іх экспрэсіўная роля ў публіцыстычным дыскурсе* ..... 81
Старокожева В.Ю. *Концепт «любовь» в произведениях современных белорусских и американских поэтов* ..... 86

Суколен А.Г. *Исследование коннотативного компонента лексической семантики в российской и китайской лингвистике* ..... 90
Хазанава К.Л. *Лексіка-тэматычная разнастайнасць каляндарных песень Гомельска-Бранскага пагранічча* ..... 94
Храбан Т.Е. *Игровой аспект интернет-коммуникации* ..... 99

**ФИЛОСОФИЯ**

Борецкая В.К. *Идея религиозно-политического дуализма в социальном учении католичества* ..... 105
Калмыков В.Н. *Роль народа, личности и элиты в истории* ..... 112
Качур Е.Л. *Современная семья в фокусе философско-антропологических исследований.* 117
Кузев В.В. *Развитие учения о посмертном воздаянии в японском буддизме* ..... 122
Лисовский П.Н. *Философия риска в феноменальных рецепциях мудрости* ..... 128
Цацарин В.В. *Типы объяснения, используемые в исторических работах Н.И. Ермоловича и А.К. Кравцевича* ..... 132

**Ministry of Education of Republic of Belarus**
**Francisk Scorina Gomel State University**

# PROCEEDINGS

## of Francisk Scorina Gomel State University

**SCIENTIFIC, PRODUCTION AND PRACTICAL JOURNAL**

There are 6 times a year
*Published since 1999*

**• 2016, № 1 (94) •**
**HUMANITIES: HISTORY • PHILOLOGY • PHILOSOPHY**

## CONTENTS

**HISTORY**

A.Y. Barsuk. *Controversy of M. Smotritsky as the definition of religious contradictions in the Polish-Lithuanian Commonwealth* ..... 5
A.S. Gorny, A.L. Ilyin. *Pinsk department of the Belarusian Cooperative Bank in Vilnius (1926-1932): establishment and activities* ..... 10
S.B. Zhikharev. *Railway construction in the activities of Starodub zemstvo in the 80s of the XIX century* ..... 16
A.V. Kostenko. *The scientific foundations of Kherson acquisition archaeological museum: the finishing touches to the intellectual biography of V.I. Goshkevich* ..... 23
A.G. Kochanowsky. *Ethnocultural emancipation of Belarusians at the junction of eras and cultures (second half of XIX – early XX centuries)* ..... 30
V.S. Selitsky. *Public-political management at the beginning of the Great Patriotic War in the Gomel region* ..... 37
Hudair Daham Ali. *National Unity Party in Iraq: the ideology and the internal Statute* ..... 43

**PHILOLOGY**

M.I. Kirushkina. *Modern feminine poetry of Gomel region* ..... 49
A.V. Krasnik. *Similarities and differences in the structure of semantic and associative meteofields* ..... 54
E.V. Nichiporchik. *Functional connection of the evaluation with the elements of the structure of value orientations (based on proverbs)* ..... 59
G.Y. Novik. *Differential features of the autobiographical documentary and fiction* ..... 65
A.D. Paulavets, D.D. Paulavets. *The fate: the word and concept (attempt of lingvocultural analysis)* ..... 69
T.I. Skorobogataya. *Derivational potential of the verbs of physical impact in the structure of phase derivational paradigms (on materials of the Russian and German languages)* ..... 75
A.A. Stankevich. *Antonymic correlation and its expressive role in the journalistic discourse* ..... 81
V.Y. Starokozheva. *The notion of «love» in the works of modern Belarusian and American poets* ..... 86
A.G. Sukolen. *The research of the connotative component of lexical semantics in the Russian and Chinese linguistics* ..... 90
K.L. Hazanava. *Lexical and thematic variety of calendar songs of Gomel-Bryansk borderland* ..... 94
T.E. Hraban. *The gaming aspect of online communication* ..... 99

**PHILOSOPHY**

V.K. Boretskaya. *The idea of religious and political dualism in the social teachings of Catholicism* ..... 105
V.N. Kalmykov. *The role of people, personality and elites in history* ..... 112

E.L. Kachur. *Modern family in the focus of philosophical and anthropological research*..... 117
V.V. Kuzev. *The development of the doctrine of posthumous retribution in Japanese Buddhism*... 122
P.N. Lisowsky. *Philosophy of risk in the phenomenal reception of wisdom* ..... 128
V.V. Tsatsarin. *Types of explanation used in historical works of N.I. Yermolovich and A.K. Kravtsevich*..... 132

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (94), 2016

## История

*УДК 930(476+477):282*

# Палеміка М. Сматрыцкага як вызначэнне канфесійных супярэчнасцей у Рэчы Паспалітай

А.Я. Барсук

М. Сматрыцкі адлюстроўвае ўмовы міжканфесійнай барацьбы, вызначае грамадскія і сацыяльна-палітычныя супярэчнасці ў Рэчы Паспалітай і магчымыя шляхі іх вырашэння. Яго творчасць падзяляецца на праваслаўны і уніяцкі перыяды. М. Сматрыцкі спачатку абараняе старажытныя прывілеі праваслаўных і свабоду веравызнання як шлях захавання сацыяльнай стабільнасці і дзяржаўнай незалежнасці. М. Сматрыцкі-ўніят – прыхільнік ідэі царкоўнай еднасці і аўтакефаліі ўніяцкай царквы, вызначэння паўнамоцтваў улады.
**Ключавыя словы:** рэлігійна-палемічная літаратура, М. Сматрыцкі, праваслаўе, уніяцтва, канфесійныя супярэчнасці.

The works of M. Smotritsky are considered. M. Smotritsky shows conditions of interfaith opposition, defines public and socio-political contradictions in the Polish-Lithuanian Commonwealth and possible ways of their decision. His creative work is divided into the orthodox and Uniate periods. M. Smotritsky at first supports birth rights of Orthodox Christians and freedom of religion as a way of preserving social stability and state independence. As a Uniate, M. Smotritsky supports the idea of church unity and autocephaly of Uniate church and that of defining authority of power.
**Keywords:** religious polemical literature, M. Smotritsky, Orthodoxy, Uniate Church, religious contradictions.

Міжканфесійнае супрацьстаянне ў Рэчы Паспалітай знайшло адлюстраванне ў рэлігійнай палеміцы, якая разгарнулася ў Рэчы Паспалітай у сувязі з Рэфармацыяй, Контррэфармацыяй і пашырэннем уніяцтва. Палемічныя творы дазваляюць вызначыць як багаслоўскія і ідэалагічныя спрэчкі, царкоўна-рэлігійныя супярэчнасці каталікоў, пратэстантаў, праваслаўных і ўніятаў, так і акрэсліць не толькі гістарычныя ўмовы прыняцця міжканфесійнай уніі, вынікі рэалізацыі рашэнняў Берасцейскага царкоўнага Сабора, але і паказаць сацыяльна-палітычныя і нацыянальныя вытокі канфесійных сурярэчнасцей. Аўтары разглядалі тэалагічныя праблемы ў сувязі з палітычнымі, сацыяльнымі і гнасеалагічнымі праблемамі. Даследаванне рэлігійнай палемікі дазваляе вызначыць асноўныя грамадскія і сацыяльна-палітычныя супярэчнасці ў дзяржаве.

У пачатку XVII ст. найбольшыя памеры набывае публіцыстыка прыхільнікаў і праціўнікаў уніяцтва. Вядучае месца сярод палемістаў займаў Мялецій Сматрыцкі, аўтар шматлікіх антыўніяцкіх і ўніяцкіх твораў, жыццё і дзейнасць якога таксама з'яўляецца адбіткам гістарычных абставін і грамадскіх супярэчнасцей у Рэчы Паспалітай.

Будучы вядомы публіцыст нарадзіўся на Украіне, вучыўся спачатку ў Астрожскай гімназіі, затым у Віленскай езуіцкай Акадэміі, наведваў лекцыі ў Нюрнбергскім, Лейпцыгскім і Вітэнбергскім універсітэтах. Пазней уступіў у Віленскае праваслаўнае брацтва, у 1617 г. стаў манахам Святадухава манастыра ў Вільні, у 1620 г. – архіепіскапам Полацкім, а ў 1628 г. з'явіліся яго ўніяцкія творы «Пратэстацыя» (1628), «Паранезіс» (1629), «Экзатэзіс» (1629) і інш.

М. Сматрыцкаму належыць выдатны помнік палемічнай літаратуры пачатку XVII ст. – «Трэнас (Фрынас), або Плач Усходняй царквы» (1610). Ён канстатаваў пад псеўданімам Тэафіл Арталог (Багалюб Златавуст) ад імя маці-царквы ў алегарычнай форме той факт, што ў выніку крызісу царквы і наступу Контррэфармацыі большасць радавітай беларускай і частка ўкраінскай магнатэрыі пакінула праваслаўе: «Дзе зараз той вельмі каштоўны каменьчык-карбункул, бліскучы, як свет, які насіў у сваёй кароне паміж іншымі перламі, як

сонца паміж зорамі, – дом князёў Астрожскіх, які вылучаўся сярод іншых бляскам святла сваёй старажытнай веры? Дзе і іншыя дарагія і вельмі каштоўныя каменні той самай кароны, слаўныя дамы рускіх князёў, неацэнныя сапфіры, надзвычай каштоўныя дыяменты: князі Слуцкія, Заслаўскія, Збаражскія, Вішнявецкія, Сангушкі, Чартарыйскія, Пронскія, Ружынскія, Саламярэцкія, Галаўчынскія, Крошынскія, Масальскія, Горскія, Сакалінскія, Лукомскія, Пузаны і іншыя многія… Дзе і другія вельмі каштоўныя мае скарбы, радавітыя, паўтараю, слаўныя, высакадумныя і даўно па ўсяму свету праслаўленыя добрай славай, магутнасцю і мужнасцю народа рускага дамы: Хадкевічаў, Глебавічаў, Кішак, Сапег, Дарагастайскіх, Войнаў, Валовічаў, Зяновічаў, Пацаў, Халецкіх, Тышкевічаў, Корсакаў, Храбтовічаў, Трызнаў, Гарнастайскіх, Бокіх, Мышкаў, Гойскіх, Сямашак, Гулевічаў, Ярмалінскіх, Чалганскіх, Каліноўскіх, Кірдзяяў, Загароўскіх, Мялешкаў, Богавіцінаў, Паўловічаў, Сасноўскіх, Скумных, Пацеяў і іншых» [1, с. 268–269].

Аўтар выступаў супраць вяршэнства папы рымскага, параўноўваў яго ўладу з турэцкай тыраніяй: «Турчын у свецкай палітыцы, а папеж у царкве Божай тыран. Турчын у Азіі толькі, а папеж усяго свету Кесарам над Кесарамі і Панам над Панамі быць хоча». Ён сцвярджаў, што зберагчы «душу вольную» лягчэй у турэцкай няволі, чым пад уладай папы. Менавіта гэты тэзіс быў падставай для абвінавачванняў праваслаўных у сувязях з Турцыяй і Масквой. П. Скарга ў творы «Перасцярога на Трэны і Лямант Тэафіла Арталога» адзначаў: «…асабліва цяпер, калі наш богабаязненны кароль ваюе з Масквой, …яна з-за чытання тых кніг будзе больш упартай, баючыся ўшчамлення свайго грэчаскага набажэнства» [2, с. 63].

«Плач усяленскай усходняй царквы» выклікаў вострую занепакоенасць кіроўных колаў: «Кожнае слова – ёсць жорсткая рана, кожная думка – смяротная атрута для уніі і папства, а таму не адны схізматыкі, але і ерэтыкі-пратэстанты з радасцю набывалі і перачытвалі гэтую кнігу. Іншыя захоўвалі яе нібы скарб і завяшчалі сваім дзецям як каштоўнейшую спадчыну; а з праваслаўнага духавенства некаторыя лічылі твор Сматрыцкага роўным з творам святых айцоў і гатовыя былі праліць за яго кроў» [2, с. 63]. Жыгімонт Ваза загадаў знішчыць тыраж выдання, друкарню зачыніць, а яе кіраўніка, Лявонція Карповіча, зняволіць.

Новая хваля палемікі распачалася з публікацыі Мялеціем Сматрыцкім 5 красавіка 1621 г. працы «Верыфікацыя нявіннасці» ў сувязі з аднаўленнем праваслаўнай мітраполіі і прызначэннем на пасады праваслаўных епіскапаў Канстанцінопальскім патрыярхам без дазволу караля Рэчы Паспалітай. Сутнасць палемікі акрэслівалі рознагалоссі ў вызначэнні права прызначэння праваслаўных іерархаў у Рэчы Паспалітай. На думку Полацкага архіепіскапа, «духоўны сан, згодна з царкоўным і свецкім правам, можа быць атрыманы толькі з рук Канстанцінопальскага патрыярха». Гэта пацвярджаецца Прывілеямі 1600, 1607 і 1609 гг., сеймавай Канстытуцыяй 1607 г. і трыбунальскімі дэкрэтамі 1605 і 1609 гг., царкоўнымі пастановамі: 6-м канонам Першага Сусветнага сабору, 2-м і 4-м канонамі Другога сабору, 8-м канонам Трэцяга сабору, 28-м канонам Чацвёртага сабору. М. Сматрыцкі распавядаў аб духоўным праве канстанцінопальскіх патрыярхаў на вялікакняжацкія землі, аб прыняцці русінамі хрысціянства з Усходу. «Што да Літвы, дык няма аніякага сумневу: напачатку Хрыстова вера была тут прынятая з Усходу. Першая жонка літоўскага князя Альгерда Ульяна (дачка віцебскага князя) і другая Марыя (дачка цвярскога князя) належалі да праваслаўнага веравызнання. Пад іх уплывам і Альгерд схіліўся да Праваслаўя. У Віцебску ён змураваў дзве багатыя бажніцы: адну ў Ніжнім замку, а другую за Ручаём. Дзяцей, якіх меў ад Ульяны і Марыі, Альгерд ахрысціў паводле праваслаўнага абраду». Сматрыцкі сцвярджаў, што ў Каталіцкім касцёле біскупы прызначаюцца без манархавай згоды. Гэты тэзіс і публікацыя некаторых лістоў караля Жыгімонта III Вазы і сенатара Станіслава Жалкоўскага, кароннага канцлера і гетмана, да Іерусалімскага патрыярха Феафана («таго грэчына – здрайцы»), а таксама абвінавачанні манарха ў парушэнні законаў сталі аб'ектам вострай крытыкі. Публікацыю ў «Верыфікацыі нявіннасці» Пратэстацыі Іова Барэцкага, дзе гучаў заклік да бунту, змагання са зброяй у руках «за веру бацькоў» і ўласныя заклікі М. Сматрыцкага да запарожскіх казакоў, людзей рыцарскага стану абараняць праваслаўе, апаненты расцанілі як «найвялікшае дзяржаўнае злачынства» [3].

У адказ на працу Сматрыцкага ўніяцкі мітрапаліт І. Вельямін-Руцкі выступіў з трактатам «Падвойная віна» (1621 г.). М. Сматрыцкі ў сваю чаргу неадкладна надрукаваў «Абарону Верыфікацыі» (1621 г.), дзе падкрэсліваў шкоднасць міжканфесійных канфліктаў, якія «спрычыняюцца да глыбокага заняпаду нашага славутага народа» [4]. І. Вельямін-Руцкі ў тым жа годзе выдаў «Экзамен Абароны» (1621 г.).

Супраць трактатаў Сматрыцкага выступілі аўтары «Ліста да законнікаў манастыра Святога Духа» браслаўскі стараста і вышэйшы пісар Януш Скумін-Тышкевіч, слонімскі падкаморы Мікалай Трызна, пан Адам Храптовіч, слонімскі харужы Юры Мялешка. Яны пагражалі публіцысту прыцягнуць яго да суда за абразу духоўных Айцоў уніяцкай царквы і шляхты, якая прымала ўніяцтва не для новых прывілеяў і не за веру, а за службу Айчыне. На іх думку, учынкі царкоўнікаў і шляхты «не належаць да тваёй дурной чарнецкай прэзумпцыі». Таксама абвінавачвалі Сматрыцкага і яго паплечнікаў у «празе духоўных сталіц», чым тлумачыцца «самачыннае» абвяшчэнне сябе духоўнымі пастырамі [5, с. 322].

У адказ на працу І. Вельяміна-Руцкага «Экзамен Абароны» ў 1622 г. у Вільні выйшаў твор «Апендыкс на Экзамен Абароны Верыфікацыі», у якім М. Сматрыцкі абараняў праваслаўную царкву ад націску ўніятаў: «Вы нашу святую, старажытную веру з грудзей вырываеце! Мандатамі, баніцыямі, інквізіцыямі, камісіямі ды дэкрэтамі задворнымі малога кола тэрарызуеце нас, няславіце і ганьбіце... Гвалтам пазбаўляеце нас права вольна здзяйсняць набажэнства, зачыняеце цэрквы, хапаеце прэсвітараў ды без усялякіх падстаў пазбаўляеце духоўных пасад». Пісьменнік вызначаў неабходнасць захавання юліянскага календара, падкрэсліваў правамоцнасць незалежных ад Рыма патрыярхаў і законнасць дзейнасці Віленскага праваслаўнага брацтва па заснаванні школ, шпіталяў і друкарняў [5, с. 321]. Працягам антыўніяцкіх настрояў М. Сматрыцкага стаў «Эленхус», дзе ён абвінавачваў уніятаў у распальванні сацыяльнай напружанасці – «нацкоўваюць падданых на паноў, а паноў на падданых» і «абвастраюць сэрцы ўсіх жыхароў Вялікага Княства», праваслаўныя вымушаны абараняцца і іх ваяўнічыя паводзіны тлумачацца абвінавачаннямі ў «здрадзе і схізме» [5, с. 323.]. Супраць яго негатыўных ацэнак уніяцтва выступіў у 1622 г. Анастасій Сялява ў творы «Антыэленхус».

У сваіх працах Мялецій Сматрыцкі палемізуе не толькі на багаслоўскія тэмы, але і абмяркоўвае філасофскія і грамадска-палітычныя пытанні. У гэтым сэнсе лепшымі ўзорамі публіцыстыкі Сматрыцкага-праваслаўнага лічацца «Юстыфікацыя нявіннасці» (адрасаваная Жыгімонту III Вазе і надрукаваная 6 снежня 1622 г.) і «Суплікацыя» (зварот да Сената і паслоў Вальнага сейма ў 1623 г.).

Так, у «Юстыфікацыі нявіннасці» М. Сматрыцкі сцвярджае, што адна з галоўных каштоўнасцей чалавека – свабода і ў тым ліку свабода выбару канфесійнай прыналежнасці: «Салодкая, вельмі салодкая Воля! Дзеля яе можна ахвяравацца не толькі маёмасцю, але і самім жыццём!.. Воля – гэта жыццё паводле агульнапрынятых законаў, а не паводле капрызаў валадароў», з-за чаго адбываецца нясправядлівасць – страта праваслаўнымі «адвечных правоў, свабод і вольнасцей» [6, с. 514]. Сваю думку мысліцель падмацоўвае цытатамі старажытнагрэчаскіх філосафаў – Дыягена, Плутарха і інш. Парушэнне законаў можа прывесці да разладу ў дзяржаве: «Дзе фундамент бурыцца, там і сцены мусяць упасці» [6, с. 523]. Праваслаўныя страцілі магчымасць мець сваіх духоўных пастыраў, таму пасвячэнне патрыярхам на духоўныя пасады адбылося без згоды манарха, але гэта нельга расцэньваць як абразу каралю, бо «патрыярх не меў ні ў думках, ні на сэрцы, каб нейкім чынам зняважыць Жыгімонтаву ўладу», і іерархі не шукалі карысці, а «дбалі пра вечныя рэчы» [6, с. 522].

У «Суплікацыі» парушэннем закону М. Сматрыцкі назваў абвінавачанні праваслаўнага святарства ў падбухторванні казацтва да супраціву і Іерусалімскага патрыярха Феафана ў дзейнасці на карысць турэцкіх улад, а таксама загад Жыгімонта III Вазы аб яго арышце. Заклікаў шляхту не парушаць закон і «працягнуць руку дапамогі пакрыўджаным і зганьбаваным» праваслаўным вернікам, якім ніколі не забаранялася мець сваіх іерархаў, падпарадкаваных Канстанцінопалю, а вялікія князі і каралі – Казімір, Ян Альбрэхт, Аляксандр, Жыгімонт I Стары, Жыгімонт II Аўгуст, Генрых Валуа і Стэфан Баторый – цанілі і адзначалі заслугі праваслаўных дзеячаў перад дзяржавай.

У пачатку 1620-х гг. склаліся новыя грамадска-палітычныя ўмовы: нарастанне сацыяльных супярэчнасцей і паглыбленне крызісу праваслаўнай царквы, наступ Контррэфармацыі, курс на замірэнне канфесій, рэформы ўніяцкай царквы І. Вельямін-Руцкім, і яго спробы схіліць да супрацоўніцтва вядучых дзеячаў праваслаўя, якія вызначылі прызнанне уніі часткай праваслаўнага святарства (Касіян Саковіч, К. Транквіліён-Стаўравецкі і інш.). Сярод іх быў і М. Сматрыцкі, які ў больш позніх сваіх творах – «Апалогіі» (1628 г.), «Аб шасці адрозненнях у вучэнні Усходняй і Заходняй цэркваў» (1628 г.) і «Катэхізісе» (каля 1628 г.) выклаў тэалагічныя асновы царкоўнай еднасці і пераконваў праваслаўных прыняць унію і адшукаць агульны мір.

М. Сматрыцкі пасля падарожжа па святых мясцінах Бліжняга Усходу, у тым ліку і ў Канстанцінопаль, ператварыўся ў абаронцу ўніі, паплечніка і сябра Вельяміна-Руцкага, падтрымаў яго ідэю стварэння ўласнай Патрыярхіі: «Каб яна была ўфундаваная ў нашых краях накшталт Маскоўскай, і мы не ехалі кожны раз некуды за дабраславеннем» і аб’ядноўвала хрысціянскіх вернікаў Вялікага Княства Літоўскага [6, с. 513–514]. 21 жніўня 1627 г. М. Сматрыцкі адкрыта заявіў аб сабе як уніят, калі звярнуўся з «Лістом да Канстанцінопальскага патрыярха», у якім заклікаў яго садзейнічаць аб'яднанню вернікаў усходняга абраду Вялікага Княства Літоўскага [7].

Пасля публікацый 1627–1629 гг. на М. Сматрыцкага абрынуліся шматлікія паклёпы і абвінавачанні ў здрадзе. Погляды Сматрыцкага ў гэты час амаль радыкальна змяніліся. Калі ў творах у абарону праваслаўя ён выступаў за мірнае суіснаванне канфесій і народаў у адной дзяржаве, даказваючы пераемнасць праваслаўнай культуры ад грэчаскай, то Сматрыцкі-ўніят лічыў, што неабходна накіраваць праваслаўных на шлях сілай: «Язвы нашага народа такой уласцівасці, што, калі не ўжывеш сіл жалеза для ачышчэння іх, ён ніколі не ачуняе і, распалены пякельным агнём, будзе з дня на дзень чэзнуць болей і болей і, нарэшце, зусім загіне» [8, с. 88]. Ён сцвярджаў, што міжканфесійная барацьба вядзе да разладу ў дзяржаве, аднак сродкі вырашэння гэтай праблемы для Сматрыцкага-праваслаўнага і Сматрыцкага-ўніята розныя. У першым выпадку ён выступаў за міжканфесійны мір шляхам гарантавання праваслаўным свабоды веравызнання, у другім – за адзіную царкву, для стварэння якой трэба прымяніць усе магчымыя сродкі, у тым ліку і прымусовыя.

У трактаце «Парэнезіс» М. Сматрыцкі даказваў, што праваслаўе – вера халопская, безнадзейная, а праваслаўная царква не мае добрай адукацыі і царкоўнага парадку. Падтрымаў праект стварэння аўтакефальнай уніяцкай царквы і ідэю царкоўнага адзінства, якую ён разглядаў як адзін з асноўных фактараў захавання самастойнасці дзяржавы. Удакладніў думку былых праціўнікаў, уніяцкіх палемістаў Л. Крэўзы і А. Сялявы, аб тым, што хрышчэнне Русі адбылося ў час адзінства Царквы, адпаведна царкоўнае адзінства з'яўляецца старажытным і гістарычна абумоўленым, а гісторыя Праваслаўнай царквы ў ВКЛ – імкненне да еднасці царквы. Першым этапам хрысціянізацыі, на думку Сматрыцкага, было хрышчэнне Русі Галіцкай у 872 г. патрыярхам Ігнаціем, які быў у адзінстве з Рымскім папам. Другі этап – хрышчэнне Русі Кіеўскай у 980 г. і ўзвядзенне на кіеўскі пасад мітрапаліта Іларыёна без санкцыі патрыярха. Першай спробай выйсці з-пад юрысдыкцыі Канстанцінопальскага патрыярха стала пасвячэнне мітрапаліта Клімента (1046 г.). Князь Вітаўт таксама імкнуўся да стварэння аўтакефаліі і з гэтай мэтай стварыў Кіеўскую мітраполію. Доказамі імкнення да уніі былі пасвячэнне папам Кіеўскага мітрапаліта Грыгорыя Балгарына (1458 г.), пасланне Кіеўскага мітрапаліта Місаіла Папе Сіксту IV (1476 г.), прызначэнне без згоды патрыярха мітрапалітам Макарыя (1595 г.). М. Сматрыцкі падкрэсліваў, што размова ідзе пра аб’яднанне канфесій, а не знішчэнне адной з іх [5, с. 274].

Такім чынам, багаслоўскія спрэчкі аб ісціннасці той ці іншай рэлігіі выйшлі за межы тэалогіі і прывялі да дыскусіі аб грамадзянскай выгодзе і праблемах міжнацыянальных зносін унутры адной дзяржавы, міждзяржаўных і ўнутрыдзяржаўных адносін, што знайшло адлюстраванне ў ідэі царкоўнай еднасці (ідэі монацаркоўнай дзяржавы, незалежнай ад знешніх абставін, у дадзеным выпадку – Маскоўскай дзяржавы і Турцыі), адпаведна ў абмеркаванні стварэння аўтакефальнай уніяцкай царквы, паўнамоцтваў царкоўнай і свецкай улады, суадносін паняццяў «суверэнітэт» і «нацыянальныя» традыцыі, грамадзянскае права і права народаў. Аднак паплечнікі Іосіф Вельямін-Руцкі і Мялецій Сматрыцкі глядзелі па-рознаму на прыкметы народнасці і адпаведна на дзяржаўнае будаўніцтва. На думку ўніяцкага мітрапаліта,

атрыбутамі народнасці з'яўляецца палітычная, этнічная, культурная і рэлігійная агульнасць для ліцвінаў. Ён меркаваў, што змена веравызнання не будзе хваравітая, таму што ўсе абрады і мова застануцца старымі, а ўнія – гэта вяртанне да «праўдзіва народнай рэлігіі» [10, с. 454–461].

У той жа час Сматрыцкі вызначаў у паняцці «народнасць» пераменную і нязменную часткі. Ён выкарыстоўваў паняцці «старое» (праваслаўныя традыцыі і звычаі народа, эстэтычныя і маральныя нормы, якія не адпавядаюць новым умовам жыцця і шкодзяць будучыні) і «новае» (пануючае становішча Каталіцкай і Уніяцкай царквы, замацаванае дзяржаўным правам, вера і культура якіх значна вышэйшыя, таму неабходна адмовіцца ад «старога» на карысць «новага». Дзяржава можа змяняць заканадаўства, уводзіць новыя правілы і змяняць звычкі народаў [5, с. 274], [11]. Разважанні пісьменніка выйшлі за рамкі канцэпцыі адзінства і набылі свецкі, дакладней, культурна-палітычны характар, паклалі пачатак сучасным ідэям экуменізму.

Такім чынам, палемічныя творы М. Сматрыцкага выходзяць за межы тэалагічных дыскусій, адлюстроўваюць умовы міжканфесійнай барацьбы ў Рэчы Паспалітай, вызначаюць грамадскія і сацыяльна-палітычныя супярэчнасці. Творчасць знакамітага палеміста падзяляецца на два перыяды: праваслаўны і уніяцкі. Да сярэдзіны 1620-х гг. галоўнай тэмай твораў пісьменніка было абгрунтаванне старажытнасці і ісціннасці праваслаўнай веры, неабходнасці захавання свабоды веравызнання і сацыяльнай стабільнасці, аднаўлення праваслаўнай іерархіі. М. Сматрыцкі-ўніят далучаецца да ідэі царкоўнай еднасці і монацаркоўнай дзяржавы, стварэння аўтакефальнай уніяцкай царквы, вызначэння паўнамоцтваў царкоўнай і свецкай улады як сродкаў вырашэння ўнутры-і знешнепалітычных праблем дзяржавы.

## Літаратура


1. Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры / склад. А.Ф. Коршунаў; пераклад А.Ф. Коршунаў. – Мінск, 1959. – С. 268–269.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Ю. Бохан, В. Голубеў, У. Емельянчык [і інш.] ; рэдкал. : М. Касцюк [і інш.]. – Мн. : Экаперспектыва, 2004. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) – 344 с.

3. Смотрицкий, М. Verificatia niewinnosci / М. Смотрицкий // Архив Юго-Западной России, издаваемый комиссиею для разбора древних актов. – Киев : Тип. Г.Т. Корчак-Новицкого, 1887. – Ч. 1, т. 7. – С. 279–344.

4. Смотрицкий, М. Obrona Verificacey / М. Смотрицкий // Архив Юго-Западный России, издаваемый комиссиею для разбора древних актов. – Киев : Тип. Г.Т. Корчак-Новицкого, 1887. – Ч. 1, т. 7. – С. 345–442.

5. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. у 6 т. ; Т. 3 : Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока / аўтары тома : В.Б. Евароўскі [і інш.] ; рэдкал. тома : В.Б. Евароўскі [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 615 с.

6. Smotrzyski, M. Justificacia niewinności. Wilnia, 1622 / M. Smotrzyski // Архив Юго-Западной России, издаваемый комиссией для разбора древних актов, состоящей при киевском, подольском и волынском генерал-губернаторе. – Киев, 1887. – Ч. 1, т. 7. – С. 511–532.

7. Смотрицкий, М. Письмо Патриарху К. Лукарису от 21.08.1627 г. / М. Смотрицкий // Кирилло-Мефодиевский сборник. – Leipzig; Paris, 1863. – Вып. 1.

8. Акты, относящіеся к исторіи Западной Россіи, собр. и изд. археогр. Коммиссіею: в 5 т. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1846–1853. – Т. 4 : 1588–1632. – 1851. – 574 с.

9. Смотрицкий, М. Апология моему странствованию на Восток. Сочинение Мелетия Смотрицкого, архиепископа полоцкого, епископа витебского и мстиславского, архимандрита виленского и дерманского / М. Смотрицкий // Кирилло-Мефодиевский сборник. – Leipzig; Paris, 1863. – Вып. 1. – С. i–lxi, 1–151.

10. «Sowita wina», сочинение, изданное латино-униатами в 1621 г. // Архив Юго-Западной России. – Киев : Лито-тип. Акц. Об. Н.Т. Корчак- Новицкого, 1887. – Ч. I, т. VII. – С. 443–510.

11. Smotrycki, M. Elenchus piśm uszczupliwych, przez zakonniki zgromadzenia Wileńskiego Św. Troyce wydanych (...) w Wilnie r. P. 1622 / M. Smotrycki // Архив Юго-Западной Россіи, издаваемый Временною коммиссіею для разбора древних актов: в 8 ч. – Кіев : Унив. тип., 1859–1914. – Т. 8., ч. 1, вып. 1 : Памятники литературной полемики православных с протестантами и латино-униатами в Югозападной Руси за XVI и XVII стол. – 1914. – С. 597–673.


Мозырский государственный педагогический
университет им. И.П. Шамякина

Поступила в редакцию 25.09.2015

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (94), 2016

*УДК 94(476) 1926/1932*

# Пінскі аддзел Беларускага кааператыўнага банка ў Вільні (1926–1932 гг.): утварэнне і дзейнасць

А.С. Горны[1], А.Л. Ільін[2]

Разглядаецца дзейнасць пінскага аддзела Беларускага кааператыўнага банка ў 1926–1932 гг. На аснове малавывучаных дакументаў з архіваў Беларусі, Літвы і Польшчы, многія з якіх упершыню ўводзяцца ў навуковы зварот, раскрываюцца ўмовы ўзнікнення аддзела, яго фінансавая дзейнасць, кіруючая структура, характарызуецца ўплыў аддзела на грамадска-палітычнае жыццё Піншчыны. Аўтары прыходзяць да высновы аб значным уплыве пінскага аддзела банка на развіццё беларускага нацыянальнага руху ў Пінскім павеце ў міжваенны перыяд.
**Ключавыя словы:** Заходняя Беларусь, Пінск, кааператыўны банк, беларускі нацыянальны рух.

The activities of the Pinsk branch of the Belarusian Cooperative Bank in 1926–1932 are discussed. The conditions for the appearance of the branch, its financial performance and governance structure characterized by the impact of separation on the socio-political life of Pinsk are revealed. The authors use little-known documents from the archives of Belarus, Lithuania and Poland, many of which are first introduced into scientific circulation. The authors conclude that the Pinsk branch of the bank had a significant impact on the development of the Belarusian national movement in Pinsk region in the interwar period.
**Keywords:** Western Belarus, Pinsk, Cooperative Bank, Belarusian National Movement.

У міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі ва ўмовах палітыкі паланізацыі польскімі ўладамі беларускага насельніцтва працягвалася арганізацыйнае развіццё беларускага нацыянальнага руху і станаўленне новых формаў палітычнай і сацыяльнай дзейнасці. Адной з такіх ініцыятыў беларускіх актывістаў у Заходняй Беларусі было стварэнне ўласнай фінансавай арганізацыі – Беларускага кааператыўнага банка ў Вільні (БКБ), які павінен быў незалежна ад польскіх фінансавых устаноў аказваць эканамічную дапамогу беларускаму насельніцтву і прыцягваць праз сваю дзейнасць новых прыхільнікаў для беларускага руху. Дадзеная фінансавая структура мела два сваіх філіялы ці аддзелы – у Глыбокім і ў Пінску, адным з эканамічных цэнтраў тагачаснага Палескага ваяводства. Гісторыя пінскага аддзела БКБ з'яўляецца маладаследаваннай старонкай беларускай нацыянальнай актыўнасці ў Палессі ў міжваенны перыяд.

У беларускай і замежнай гістарыяграфіі, працах краязнаўцаў праблема дзейнасці пінскага аддзела БКБ не стала аб'ектам асобнага даследавання. На сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі гэтая тэматыка разглядалася толькі ў сувязі з вывучэннем дзейнасці Беларускага кааператыўнага банка на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У прыватнасці ў артыкулах польскай даследчыцы К. Гамулкі і беларускага гісторыка А. Радзюка былі прадстаўлены агульныя звесткі аб існаванні ў Пінску аддзела БКБ, яго кіраўніках і колькасці членаў [1, s. 96–97], [2, с. 146–147]. Фрагментарна дзейнасць пінскага аддзела разглядалася ў артыкуле А. Ільіна, прысвечанаму развіццю банкаўскай сістэмы ў міжваенным Пінску [3]. Аднак выяўленне ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы значнай колькасці дакументаў Беларускага кааператыўнага банка, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы зварот у дадзеным артыкуле, а таксама выкарыстанне іншых дакументаў з беларускіх і польскіх архіваў ствараюць магчымасць правядзення больш грунтоўнага даследавання адзначанай праблематыкі, раскрыцця раней малавядомых аспектаў дзейнасці пінскага аддзела БКБ.

Беларускія грамадскія і палітычныя дзеячы ўжо з 1921 г. рабілі захады па ўтварэнні ўласнай фінансавай установы ў Заходняй Беларусі, але па прычыне палітычных і эканамічных перашкод гэтая ідэя была рэалізавана толькі ў 1925 г. 14 лютага 1925 г. Віленскі акруговы суд зацвердзіў статут таварыства з абмежаванай адказнасцю «Беларускі кааператыўны банк у Вільні», сярод заснавальнікаў якога былі Ф. Ярэміч, А. Луцкевіч, В. Багдановіч, Б. Тарашкевіч, А. Уласаў, П. Мятла, А. Назарэўскі, Р. Астроўскі, С. Рак-Міхайлоўскі і інш. [2, с. 145], [4, с. 29–31]. Аднак арганізацыйная праца па ўтварэнні

кіраўнічай структуры банка і прыцягненні ўкладчыкаў расцягнулася амаль на восем месяцаў, таму БКБ пачаў працаваць толькі ў лістападзе 1925 г. Кіруючымі органамі таварыства былі ўправа, наглядальная рада і агульны сход сяброў банка. Першым старшынёй управы БКБ з'яўляўся Р. Астроўскі, наглядальнай рады – С. Рак-Міхайлоўскі [5, арк. 1]. Як падкрэслівае даследчык А. Радзюк, першапачаткова банк павінен быў быць агульнабеларускай фінансавай установай, якая б аб'ядноўвала дзеячоў розных палітычных арыентацый, аднак хутка ён трапіў пад кантроль Беларускай сялянска-работніцкай грамады [2, с. 146].

Паводле статута, мэтай таварыства было развіццё гаспадарчага дабрабыту яго членаў шляхам прыняцця ўкладаў і выдачы крэдытаў. Падчас уступлення ў БКБ кожны член павінен быў унесці пай у 50 злотых, з якіх 25 злотых уносіліся адразу, а астатнія 25 – на працягу года [6, арк. 7]. На 31 снежня 1925 г. налічвалася 38 сяброў банка, аднак у 1926 г. назіраўся іх значны рост, што было звязана, у першую чаргу, з арганізацыйным станаўленнем БСРГ і дзейнасцю яе агітатараў у правінцыі. Таму, паводле гадавой справаздачы на 1 студзеня 1927 г. у склад банка ўваходзілі ўжо 963 сябры, з якіх 874 – сяляне, 7 – уласнікі гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў, 7 – сельскія і прамысловыя работнікі, 64 – супрацоўнікі дзяржаўных і прыватных устаноў, 11 – прадстаўнікі іншых прафесій [5, арк. 1 адв., 4 адв.]. На канец 1927 г. баланс БКБ складаўся з сумы ў 45 242 злотых і 12 055 долараў ЗША [5, арк. 46]. Неабходна заўважыць, што польскія спецслужбы звязвалі эканамічны рост БКБ у гэты перыяд з фінансавай дапамогай дзеячам БСРГ і кіраўніцтву банка з боку Камінтэрна [7, с. 262]. Да гэтага часу не выяўлена канкрэтных дакументаў, якія б пацвярджалі дадзеную думку, аднак наяўнасць на рахунках Р. Астроўскага, С. Рак-Міхайлоўскага і іншых дзеячаў БСРГ значных грашовых сум у злотых і доларах ЗША ствараюць падставы для больш падрабязнага вывучэння версіі аб савецкай фінансавай дапозе беларускім арганізацыям у Заходняй Беларусі [5, арк. 10].

Як адзначалася ў першым параграфе статута БКБ, банк меў права ствараць свае рэгіянальныя аддзелы. У пачатку 1926 г. першы аддзел быў утвораны ў мястэчку Глыбокае [2, с. 146]. Пінск як месца размяшчэння другога аддзела БКБ быў абраны, верагодна, Р. Астроўскім, які ў пачатку 1920-х гг. пражываў у гэтым горадзе і меў пэўнае кола сваіх знаёмых. У студзені 1926 г. у Пінску ўжо дзейнічаў прадстаўнік БКБ Міхаіл Васілеўскі (1891 – пасля 1944), які займаўся справай грашовых пераводаў для атрымальнікаў з Піншчыны [8, арк. 2]. Ураджэнец Слуцкага павета, настаўнік паводле адукацыі, Васілеўскі падтрымліваў цесныя, нават сяброўскія стасункі з Астроўскім яшчэ з часоў іх сумеснай працы ў Слуцкай беларускай гімназіі і пінскім філіяле Польска-амерыканскага камітэта дапамогі дзецям у пачатку 1920-х гг., меў сталыя кантакты з кіраўніцтвам БСРГ, друкаваўся ў беларускіх газетах левай арыентацыі пад псеўданімам «Пінчук» [9, арк. 380], [10, арк. 5–6]. Кіраўніцтва банка ўскладвала вялікую надзею на адкрыццё свайго аддзялення менавіта ў Пінску, які на той час з'яўляўся адным з эканамічных і гандлёвых цэнтраў Палескага ваяводства. Так у лісце да Васілеўскага Р. Астроўскі, сярод іншага, адзначаў: «Ня трэба так пэсымістычна глядзець, бо банк разьвіваецца, а пінскі аддзел, маю надзею перашчагаляе ўсе [аддзелы]» [8, арк. 9 адв.]. Таксама не выключана, што беларускія дзеячы разлічвалі выкарыстаць пінскі аддзел як яшчэ адну пляцоўку для распаўсюджвання беларускай нацыянальнай свядомасці і палітычных ідэй БСРГ на Палессі, якое знаходзілася на перэферыі беларускага нацыянальнага руху.

Урачыстае адкрыццё пінскага аддзела БКБ адбылося 7 красавіка 1926 г. у памяшканні прасторнага аднапавярховага драўлянага дома на тагачаснай вуліцы Дамініканскай, 13, які здавала ў арэнду яго ўладальніца А. Пугачова, жыхарка вёскі Дабраслаўка Пінскага павета (будынак не захаваўся да нашага часу – А.Г., А.І.). Паводле карэспандэнцыі ў газеце «Беларуская справа» на ўрачыстасці «сабралося шмат народу – выключна сялян з недалёкаразмешчаных ад Пінска вёсак Пінкавіцкае, Ставэцкае і Жабчыцкае валасьцёў». З Вільні на адкрыццё аддзела прыбылі пасол польскага сейма П. Мятла і кіраўнік БКБ Р. Астроўскі. Яны азнаёмілі прысутных з дзейнасцю цэнтральнага аддзела банка ў Вільні, яго статутам, тымі фінансавымі аперацыямі, якія будзе праводзіць аддзел банка на Піншчыне. У прыватнасці Астроўскі падкрэсліў, што банк праз таннае крэдытаванне будзе спрыяць сялянам, якія аднаўляюць сваю гаспадарку пасля ваеннага разбурэння [11]. На

мерапрыемстве прысутнічалі таксама першыя 25 членаў пінскага аддзела, прынятыя яшчэ праз цэнтральны віленскі аддзел. Цікава, што для новапрынятых членаў пінскага аддзела пасля адкрыцця быў арганізаваны ўрачысты раўт [8, арк. 9 адв.].

Мясцовая беларуская інтэлігенцыя, дзеячы БСРГ і іншых беларускіх і польскіх леварадыкальных арганізацый праводзілі шырокую агітацыю ў Пінскім павеце, заклікаючы сялян далучацца да працы пінскага аддзела БКБ. У гэтым кірунку, акрамя ўласна М. Васілеўскага, найбольш актыўна дзейнічалі М. Ключановіч, Ю. Кротаў, член мясцовай ячэйкі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі Д. Палякоў-Галайда, старшыня пінскага аддзела Незалежнай сялянскай партыі М. Машчук і інш. [12, арк. 84, 170]. Дзякуючы іх дзейнасці, ўжо ў маі 1926 г. пінскі аддзел меў у сваім складзе, паводле М. Васілеўскага, каля 300 сяброў [13]. Аднак Пінскае староства ў сваёй справаздачы за май таго ж года падавала лічбу ў два разы менш – каля 145 зарэгістраваных членаў [12, арк. 170]. Разам з тым, мясцовая ўлада падкрэслівала, што пасля адкрыцця пінскі аддзел пачаў інтэнсіўна развівацца, а колькасць яго кліентаў значна павялічвалася. На люты 1930 г. аддзел банка налічваў 423 сябры, большасць з якіх складалі сяляне з Пінскага павета [14, арк. 103].

У крыніцах мясцовай польскай адміністрацыі і гістарыяграфіі сустракаюцца сведчанні аб тым, што пінскі аддзел абслугоўваў выключна сваіх зарэгістраваных членаў альбо сяброў БСРГ [2, с. 146], [15, s. 111]. Так, напрыклад, Палескае ваяводскае ўпраўленне ў адной са сваіх справаздач за 1926 г. паведамляла, што кіраўнік аддзела Васілеўскі выдаваў пазыкі «толькі тым, хто прадаставіць партыйны білет» [12, арк. 13]. Дадзенае меркаванне, аднак, не адпавядала рэчаіснасці. У Пінскім павеце арганізацыя мясцовых гурткоў БСРГ пачалася толькі ў чэрвені 1926 г., а найбольш актыўна – у жніўні і верасні, калі пінскі аддзел ужо меў значную лічбу сваіх членаў. Кліентам банка мог быць любы жадаючы, але асобы, якія падавалі дэкларацыі на ўступленне ў лік сяброў банка, мелі пэўныя льготы, напрыклад, маглі атрымаць крэдыт на большую суму і працяглы тэрмін. Кліенты, якія не з'яўляліся пайшчыкамі пінскага аддзела мелі права атрымаць пазыку ў банку, аднак на кароткі тэрмін і абавязкова пад заклад каштоўных рэчаў [8, арк. 16]. Напрыклад, адным з такіх кліентаў у жніўні 1926 г. з'яўляўся вядомы беларускі мастак Я. Драздовіч [8, арк. 39].

Трэба, аднак, прызнаць, што БСРГ і, у некаторай ступені, КПЗБ аказвалі пэўны ўплыў на пінскі аддзел БКБ, прынамсі ў 1926–1927 гг. Дадзеная акалічнасць дазваляла польскім уладам у гэты перыяд разглядаць дзейнасць аддзела выключна ў прывязцы да дзейнасці мясцовых леварадыкальных груп, што адлюстравана ў дакументах польскай адміністрацыі [10, арк. 1 адв.], [12, арк. 170], [15, s. 118]. Паказальна, што некаторыя пайшчыкі пінскага аддзела, якія нават не праяўлялі ніякай актыўнасці ў грамадска-палітычным жыцці, знаходзіліся пад наглядам паліцыі. Напрыклад, у чэрвені 1927 г. кіраўнік аддзела паведамляў цэнтральнаму кіраўніцтву ў Вільні: «1 чэрвеня гэтага году сябра Банку Марка Саўчончык з вёскі Завідчыцы Хойненскай вол[асці] заявіў, што хойненскі камендант паліцыі Сенкевіч некулькі разоў прымушаў яго выпісацца з ліку сяброў Беларускага Банку, пагражаючы трохмесячнай адсіткай у турме» [16, арк. 110–110 адв.].

Першапачаткова штат супрацоўнікаў пінскага аддзела БКБ складаўся ўсяго з аднаго чалавека – кіраўніка аддзела ці «ўпаўнаважанага цэнтральнага банка». У 1926–1927 гг. гэтую пасаду займаў, як ўжо адзначалася вышэй, М. Васілеўскі, які атрымліваў штомесячны заробак у 100 злотых [8, арк. 22]. Пасля шматлікіх просьбаў Васілеўскага, у жніўні 1926 г. віленскае кіраўніцтва банка дазволіла пінскаму аддзелу прыняць на працу другога супрацоўніка – Міхаіла Ключановіча (1901–1938), які, паводле банкаўскай дакументацыі, займаў пасаду «канторшчыка» з аплатай у 50 злотых [5, арк. 4], [8, арк. 38]. Трэба адзначыць, што Ключановіч з'яўляўся вядомым беларускім актывістам і літаратарам у Пінску: у мінулым ён быў удзельнікам слуцкага паўстання 1920 г., у сярэдзіне 1920-х гг. актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі гурткоў БСРГ на Піншчыне, стварыў у горадзе руска-беларускую грамадскую бібліятэку [17], [18]. Абодва супрацоўнікі аддзела ажыццяўлялі сваю дзейнасць фактычна да студзеня 1927 г. 5 студзеня Васілеўскі паведаміў у Вільню, што Пінскае староства загадала яму пакінуць абшар Палескага ваяводства па прычыне адсутнасці польскага грамадзянства. У сярэдзіне студзеня 1927 г., падчас ліквідацыі польскімі ўладамі БСРГ і арышту

яе кіраўніцтва, ён быў арыштаваны і па пастанове пракурора Пінскага акруговага суда заключаны ў віленскую турму Лукішкі. Аднак пасля правядзення следства Васілеўскага апраўдалі і вызвалілі з-пад варты; у 1928 г. ён вярнуўся у Пінск, але ўжо не працаваў на пасадзе кіраўніка аддзела, з'яўляючыся толькі яго звычайным сябрам [10, арк. 1–2], [16, арк. 66].

Разгром БСРГ меў пэўныя наступствы як для цэнтральнага віленскага аддзела БКБ, так і для аддзелаў у правінцыі. Былі арыштаваны ўсе члены кіраўнічай управы БКБ у Вільні, над пінскім і глыбоцкімі аддзеламі навісла пагроза канчатковага закрыцця [1, s. 97], [5, арк. 41]. Па прадпісанні Віленскага акруговага суда пінскі аддзел павінен быў прадаставіць па справе Грамады ў якасці рэчавых доказаў касавыя кнігі, вексельныя кнігі, спіс зарэгістраваных сяброў і іншыя дакументы [19, арк. 22]. Тым не менш, нягледзячы на цяжкую палітычную сітуацыю, колькасць кліентаў і сяброў аддзела не зменшылася, а наадварот узрастала. М. Ключановіч, які кіраваў справамі аддзела ў гэты перыяд, паведамляў у Вільню: «Штодзённа зварочваюцца ў Пінскі Аддзел многа кліентаў: адны – плаціць грошы, другія – пазычыць, а трэйція – запісацца. І ўсе чакаюць упаўнамочанага на Пінскі Аддзел» [16, арк. 65]. 22 лютага 1927 г. управа БКБ у Вільні прызначыла ў Пінск новага кіраўніка – Баляслава Антановіча (1877–?), які праз тры дні прыняў справы аддзела. Паводле паліцэйскіх данясенняў, Антановіч нарадзіўся ў маёнтку Грушаўка Ляхавіцкай воласці, да пераезду ў Пінск пражываў у Баранавічах, меў добрую маральную рэпутацыю [16, арк. 62], [20, арк. 97]. Ён кіраваў пінскім аддзелам да самага яго закрыцця ў 1932 г. М. Ключановіч працаваў у банку да 1 жніўня 1928 г., калі ў сувязі з агульным скарачэннем штату БКБ быў зволены з пасады «канторшчыка» [8, арк. 106].

Асноўная дзейнасць пінскага аддзела БКБ заключалася ў прадастаўленні сялянам і іншым кліентам пазык. Напрыклад, у 1927 г. крэдыты выдаваліся ў асноўным у доларах ЗША, пасля – выключна ў злотых [8, арк. 81]. На 1929 г. аддзел выдаваў сваім сябрам пазыкі на тры месяцы ў памеры 400 злотых пад 14 % гадавых з правам адтэрміноўкі выплаты яшчэ на тры месяцы [16, арк. 114], [20, арк. 97]. У асноўным сяляне звярталіся ў аддзел за пазыкамі перад значнымі сельскагаспадарчымі работамі – пасевам збожжа і інш. Банк таксама прымаў ад кліентаў тэрміновыя ўклады, аднак іх колькасць была невялікай, напрыклад у 1928 г. налічвалася ўсяго 2 рахункі на суму ў 572 долары ЗША [5, арк. 44]. Пінскі аддзел не займаўся крэдытаваннем беларускіх сельскагаспадарчых кааператываў, якія існавалі на тэрыторыі Пінскага павета [21, арк. 8].




Дыяграма 1 – Выдача крэдытаў насельніцтву пінскім аддзелам БКБ у злотых і доларах ЗША у 1926–1932 гг. Крыніца [5, арк. 4 адв., 44, 82, 102, 124].

Паводле сведчанняў польскіх уладаў, пасля разгому БСРГ пінскі аддзел пачынаў паступова прыходзіць у заняпад [15, s. 119]. Аднак аналіз дакументацыі БКБ дазваляе сцвярджаць, што аддзел банка ў Пінску ў гэты перыяд развіваўся і даволі паспяхова працаваў амаль да канца 1930 г. Аб гэтым сведчыць узрастанне сумы і колькасці крэдытаў, выдаваеных насельніцтву на працягу 1926–1930 гг. (дыяграма 1). У 1929 г. сальда касы аддзела прадстаўляла даволі значныя сумы ў злотых, на што звяртала ўвагу нават віленскае кіраўніцтва банка [8, арк. 143].

Неабходна адзначыць, што аддзел БКБ з'яўляўся адным з асяродкаў беларускасці ў Пінску і Пінскім павеце, значным каталізатарам нацыянальнай свядомасці мясцовых жыхароў. Уся ўнутраная і знешняя дакументацыя аддзела вялася выключна на беларускай мове. Праз дакументацыю аддзела можна прасачыць, як частка малапісьменных сялянаў пры звароце ў банк за пазыкай імкнулася аформіць сваю заяву на літаратурнай беларускай мове [22, арк. 1, 22, 34]. Аддзел быў месцам, дзе праходзілі адукацыйныя лекцыі для сялянства на тэму кааперацыі, якія арганізоўвалі вядомыя беларускія дзеячы [16, арк. 8]. У памяшканні аддзела часам ажыццяўляўся збор грашовых сродкаў для Таварыства беларускай школы (ТБШ) і іншых беларускіх культурна-асветніцкіх устаноў [23, арк. 1].

31. Ничипорчик, Е.В. Оправдание в аспекте отражения ценностных ориентаций (на материале русских паремий) / Е.В. Ничипорчик // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2014. – № 1 (82). – С. 108–114.

32. Семенова, Е.Н. Аргументативные паремические конструкции в разноструктурных языках : на материале русского, немецкого и чувашского языков : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.20 / Е.Н. Семенова ; Чувашск. гос. ун-т. – Чебоксары, 2007. – 23 с.

33. Белецкая, А.Ю. Пословица как прецедентная единица в аргументативном дискурсе [Электронный ресурс] : дис…канд. филол. наук : 10.02.04 / А.Ю. Белецкая. − Самара, 2002. – Режим доступа : http://www.dissercat.com. – Дата доступа : 11.09.2012.

34. Аверина, С.Н. Пословично-поговорочные паремии как аргументативные средства языка : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.19 / С.Н. Аверина ; Кубан. гос. ун-т. − Краснодар, 2005. − 159 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 04.01.2016

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (94), 2016

*УДК 821.161.3.09*

# Дыферэнцыяльныя адметнасці аўтабіяграфічнай і дакументальна-мастацкай прозы

Г.Ю. Новік

Даследуюцца дыферэнцыяльныя адметнасці двух тыпаў літаратуры нон-фікшн – аўтабіяграфічнай і дакументальна-мастацкай прозы.
**Ключавыя словы:** аўтабіяграфічная проза, дакументальна-мастацкая проза, хранатоп, факт, дакумент.

Differential features of two types of non-fiction literature – autobiographical prose and documentary-fiction – are investigated.
**Keywords:** autobiographical prose, documentary-fiction, chronotop, fact, document.

Літаратура факта, ці нон-фікшн, адметная разнастайнасцю характарыстык, якія не толькі дазваляюць адмежаваць непрыдуманую прозу ад мастацкай, але і ўплываюць на жанравы склад першай. Так, напрыклад, нестатычнасць ролі аўтара абумовіла вылучэнне ў межах гэтай літаратуры аўтабіяграфічных (дзённікі, мемуары, споведзі) і дакументальна-мастацкіх (мастацкія хронікі, эсэ, белетрызаваныя біяграфіі) тэкстаў. Паспрабуем вызначыць спецыфіку двух тыпаў прозы нон-фікшн.

Улічваючы жанрава-зместавую нятоеснасць аўтабіяграфічнай і дакументальна-мастацкай прозы, можна сцвярджаць пра адметнасць рэалізацыі паняццяў «факт» і «дакумент» і іх функцый у межах кожнай. У дзённіках, мемуарах і споведзях любыя праявы рэчаіснасці адлюстроўваюцца аўтарам як фактычныя, але з цяжкасцю могуць вытрымліваць верыфікацыю аб’ектыўнасцю. З мэтай пераканання чытача ў сапраўднасці, праўдзівасці напісанага аўтары прымяняюць спецыфічны адбор матэрыялу, пры якім фокус увагі засяроджаны не толькі на асобе біяграфічнага стваральніка, але і на вядомых пэўнаму колу чытачоў падзеях культурнага, сацыяльнага жыцця і славутых дзеячах, згадкі пра якіх могуць неаднаразова паўтарацца ў сведчаннях іншых сучаснікаў, даведніках, дакументах і такім чынам не выклікаюць адчування грунтоўнай фальсіфікацыі вобразаў. У дакументальна-мастацкіх творах (белетрызаваных біяграфіях, фрагментарнай прозе), наадварот, адносіны аўтара да аб’екта адлюстравання можна ахарактарызаваць як адвольную інтэрпрэтацыю агульнавядомых з’яў і падзей, паколькі ў якасці факталагічнай асновы выступае вобраз рэальна існуючай асобы, характар якой у тэксце раскрываецца адпаведна з аўтарскай задумай, ці асобныя непрыдуманыя факты ўключаюцца ў творы пісьменніка.

Немалаважным аб’ектам даследавання ў прозе нон-фікшн з’яўляецца катэгорыя хранатопа, якая, паводле М. Бахціна, «вызначае мастацкае адзінства літаратурнага твора ў яго адносінах да рэальнай рэчаіснасці» [1]. Цесная ўзаемасувязь часавых і прасторавых адносін арганізуе твор, выбудоўвае ланцужок асацыяцый у свядомасці чытача і такім чынам не толькі ўводзіць яго ў кантэкст напісанага, але і вымушае праводзіць паралелі з рэальным жыццём. Літаратура нон-фікшн разумее час і прастору як неад’емныя каардынаты свету, у абсягу якіх існуюць дакументы і іх мастацкія апрацоўкі. У большасці сучасных твораў назіраецца тэндэнцыйнасць да множнасці і сімвалізацыі часу, што непасрэдна звязана з неабходнасцю зваротаў да памяці персанажа (напрыклад, у творах «Адам Клакоцкі і ягоныя цені», «Хвілінка» І. Бабкова, «Інтрадукцыя» Л. Дранько-Майсюка і інш.). Мнеманічнаму прынцыпу падпарадкаваны па сутнасці ўсе творы аўтабіяграфічнай прозы, дзе ў якасці адзінак часу нярэдка выступаюць асобныя сітуацыі і ўспаміны, сегментацыя часу адбываецца па волі аўтара і не пазбаўлена пэўных лакун. Відавочна, распаўсюджанай адметнасцю тут з’яўляецца практыка тэмпаральнага падваення, ці апліцыравання пунктаў

гледжання, уласцівых аўтару ці герою ў розныя перыяды часу; накладання гістарычнага часу на час апавядальніка; а таксама незамкнёнасць, адкрыты фінал твора (як у «Сечцы» А. Федарэнкі, «Палімпсесце» А. Аркуша, «Дзённіках» Н. Гілевіча і інш.). У адрозненне ад формы дзённіка, споведзям і мемуарам характэрна супастаўленне двух часоў – перыяду, калі адбываліся дзеянні, і часу іх занатавання – і рэтраспектыўнасць. Такім чынам, хранатоп апошніх набліжаецца да часава-прасторавай арганізацыі мастацкіх тэкстаў, паколькі набывае тут, як адзначае Н. Гарбер, ідэалізаванасць, «замкнёнасць і намераную нелінейнасць, бо акцэнтуе ўвагу на задуме аўтара і вядзе чытача па вызначанай «легендзе» віртуальнай літаратурнай мясцовасці» [2]. У дзённіку ж катэгорыя хранатопу не характарызуецца аднастайнасцю і рэалізаваная ў наступных разнавіднасцях:

– псіхалагічны хранатоп, які падпарадкаваны душэўным рытмам аўтара і мае даволі ўмоўныя межы, акрэсленыя топасамі сноў, фантазій, успамінаў і г. д. («Трынаццаць дзён з дзённіка Антона Кудлатага» А. Кудласевіча);

– лакальны хранатоп, адметны строгай паслядоўнасцю фіксацый падзей, што адлюстроўваюць будзённае існаванне аўтара ў межах кожнага дня («Лісты абляцелыя» А. Жука, «Трагічны дзевяноста шосты», «Год двухтысячны» Н. Гілевіча);

– кантынуальны хранатоп, найбольш глыбокі з усіх узгаданых, паколькі час і прастора ў творах гэтай групы выходзяць за межы «тут» і «зараз» праз імкненне аўтараў да максімальнага ахопу падзей, нават тых, сведкамі якіх не былі («Дзённікі» С. Яновіча, «Белавежская пушча. Рэзалюцыя SOS» В. Дранчука, «Дні мае, падарункі» К. Цвіркі, «Шпітальны дыярыуш» П. Васючэнкі і інш.).

Хранатоп дакументальна-мастацкіх твораў перадусім надае ім завершанасць, замкнёнасць, забяспечваючы пры гэтым нелінейнасць сюжэта і пазбаўленне эфекту недагаворанасці. На спецыфіку прасторава-часавай арганізацыі такіх тэкстаў уплывае ўжо не столькі псіхатып асобы аўтара, яго ўзрост, сацыяльна-гістарычныя варункі, колькі суаднесенасць твораў з пэўным жанрам. Так, для эсэ ўласцівым з'яўляецца віртуальны хранатоп, фрагментарнай прозы – спалучэнне біяграфічнага часу з дэталізаванай, замкнёнай прасторай, белетрызаванай біяграфіі – сінтэз біяграфічнага і гістарычнага часоў з рэальным і ўяўным абсягам. Адметнай з'явай выступае мастацкая хроніка, жанрава падобная да формы дзённіка, але разам з тым падпарадкаваная структурнай арганізацыі ўсяго твора (то бок з'яўляецца толькі адным з фрагментаў тэксту, як, напрыклад, у «Караблі» В. Гігевіча ці «Лаўцы святла поўні», «Апладненні ёлупа» Ю. Станкевіча).

Не менш актуальным паўстае пытанне генезісу жанраў у межах нон-фікшн. Найбольш «старажытнымі» з'яўляюцца форма дзённіка, якая эвалюцыянавала ад летапісаў, дарожных нататак (хаджэнняў), дзелавой дакументацыі; мемуары, што ўзыходзяць да жыцій і юрыдычных дакументаў (паказанняў сведак); споведзь, трансфармаваная з рэлігійнага сакрамэнту; і белетрызаваныя біяграфіі, якія паходзяць ад жыцій, рамана-біяграфіі, мемуараў і біяграфічных нарысаў. Відазмяненне жанраў-першаасноваў адбывалася пад уплывам працэсаў паступовай белетрызацыі, эсэізацыі і надання творам публіцыстычных рыс, якія застаюцца атрыбутыўнымі для прозы нон-фікшн.

Так, публіцыстычнасць ахоплівае і асобныя дзённікі («Белавежская пушча. Рэзалюцыя SOS» В. Дранчука), і мемуары («След матылька. Освальд у Менску» А. Лукашука, «Альбом сямейны» В. Мудрова), і эсэ («Каты Ёзафа Ратцынгера» С. Астраўца), і нон-фікшн, якая апісвае мастацкую літаратуру («Гамбурскі рахунак» А. Бахарэвіча), і феномен псеўданон-фікшн («Малая медычная энцыклапедыя» А. Бахарэвіча). Пры гэтым ва ўсіх вышэйзгаданых творах публіцыстычнасць праяўляецца на ўзроўні ўплыву, а не грунтоўнай сэнса- і структураўтваральнай катэгорыі. Сведчаннем таму – асобныя сентэнцыі, практычныя рэкамендацыі, інтэнцыя на больш дзейсны ўплыў на рэчаіснасць. Акрамя гэтага вядома, што журналістыка праз канкрэтнасць і праўдзівасць выкарыстаных ёй фактаў прывязвае абсяг разгортвання падзей у тэксце да асобнай дзяржавы, рэгіёна, горада і г. д. У названых вышэй творах агульным топасам для разгортвання мысленчага і фізічнага дзеяння з'яўляецца

Беларусь, якая ўяўляе сабой універсальны канцэпт. Яшчэ адна рыса, якая вызначае падабенства асобнай плыні нон-фікшн і журналістыкі – арыентацыя на факт, прычым у абодвух выпадках можа ісці размова пра тую ці іншую ступень яго мастацкай інтэрпрэтацыі.

У заходнім літаратуразнаўстве феномен пашырэння белетрыстычных уплываў на літаратуру нон-фікшн утварыў спецыфічную з'яву, якая атрымала назву creative non-fiction. Нягледзячы на прынятую ідэнтыфікацыю гэтай з'явы ў якасці асобнага жанру, больш мэтазгодна разглядаць яе як наджанравае ўтварэнне, паколькі асноўная функцыя creative non-fiction – павелічэнне ступені мастацкай трансфармацыі дакументальных і публіцыстычных жанраў, якое прасочваецца ў асобных тэкстах. Да прыкладу, твор «След матылька. Освальд у Мінску» А. Лукашука, які ўяўляе сабой глыбокае журналісцкае даследаванне мінскага перыяду жыцця Лі Гарві Освальда. Сярод асноўных патрабаванняў да такіх твораў – выкарыстанне ў якасці аб'екта нарацыі прадмета / з'явы з рэальнага свету, вычарпальнае яе даследаванне, наяўнасць вялікай колькасці апісанняў, суб'ектыўная перадача кантэкстаў, а таксама публіцыстычнасць, вытанчанасць пісьма. Падобныя рысы вылучае руская даследчыца С. Бозрыкава, прапанаваўшы для такой літаратуры аўтарскі тэрмін «мастацка-дакументальны наратыў», што «<…> утрымлівае 1) публіцыстычнасць (актуальнасць, фактычны змест матэрыялу, "пагружэнне"; 2) мастацкасць (кампазіцыйныя, стылістычныя, мастацкія дэталі); 3) выражаны пункт гледжання журналіста» [3]. Такім чынам, тэкст creative non-fiction адрозніваецца ад літаратуры нон-фікшн фактычнай канкрэтнасцю, сінтэзаванай з падкрэслена павышанай увагай да літаратурнага стылю і тэхнікі. Таму адмежаванне мастацка-дакументальнага наратыву ад уласна мастацкай літаратуры часта застаецца праблемным.

Сярод жанраў creative non-fiction Л. Гаткінд вылучае «эсэ, часопісны артыкул, навукова-даследчую работу, мемуары, ці верш, ён [жанр. – Г. Н.] можа быць асабістым ці не, ці можа адначасова ахопліваць усё гэта» [4]. Можна сцвярджаць, што на беларускай глебе адзначаны наджанравы ўплыў ахапіў адносна невялікую колькасць твораў, што звязана з нявычарпанасцю магчымасцей «традыцыйнай» нон-фікшн. Да тэкстаў з мастацка-дакументальным наратывам адносяцца асобныя дыярыушы («Трынаццаць дзён з дзённіка Антона Кудлатага» А. Кудласевіча), мемуары («Сіняя кніга беларускага алкаголіка» А. Кулона, «Альбом сямейны» В. Мудрова, «Requiem па непатрэбных рэчах» В. Шалкевіча), белетрызаваныя біяграфіі («След матылька. Освальд у Мінску» А. Лукашука). Асаблівыя адносіны склаліся ў creative non-fiction з феноменам псеўданон-фікшн, дзе першаму адводзіцца роля метадалагічнай асновы.

Беларускай літаратуры факту таксама шырока ўласцівы працэс эсэізацыі, якая, як і белетрызацыя, з'яўляецца вынікам тэндэнцыі да максімальнага збліжэння элітарнага і масавага культурнага абсягу, што многімі навукоўцамі тлумачыцца як прыкмета агульнага культурнага крызісу, уласцівага эпосе постмадэрнізму. М. Эпштэйн слушна сцвярджае, што зварот да эсэізму «дазваляе дасягаць найбольшай змястоўнасці пісьма, спалучаючы рознаўзроўневыя і рознаякасныя паняцці» [5, с. 336]. Насамрэч, магчымасць укладання плыні аўтарскай свядомасці ў адвольную форму абумовіла максімальную свабоду творчасці, што, у сваю чаргу, выявілася ў шырокім разгалінаванні эсэ ў межах жанру (раман-эсэ, фрагментарнае эсэ, мета-эсэ і інш.), а таксама выкарыстанні эсэ ў розных сферах (журналістыцы, мастацкай літаратуры, нон-фікшн).

Такім чынам, адметнымі рысамі аўтабіяграфічнай прозы з'яўляюцца акцэнт на ўнутраным свеце аўтара-наратара; падпарадкаванасць твораў мнеманічнаму прынцыпу; пераважная рэтраспектыўнасць апісанняў, сумяшчэнне цяперашняга і мінулага часоў, адкрытасць фіналу, храналагічнасць. Дакументальна-мастацкім творам, наадварот, уласціва засяроджанасць на падзеях знешняй рэальнасці, якія маюць гістарычную значнасць і адвольна інтэрпрэтуюцца аўтарам; завершанасць, замкнёнасць кампазіцыі, пазбаўленасць эфекту недагаворанасці; зніжэнне ролі хранатопу і інш. Разам з тым абодвум тыпам прозы нон-фікшн уласціва тэндэнцыя да белетрызацыі, эсэізацыі і надання творам публіцыстычных рысаў.

**Літаратура**

1. Бахтин, М.М. Формы времени и хронотопа в романе [Электронный ресурс] / М. Бахтин. – Режим доступа : http://www.chronos.msu.ru/old/ RREPORTS /bakhtin_hronotop/hronotop10.html. – Дата доступа : 02.08.2015.

2. Гарбер, Н. Соотношение реального и художественного хронотопа в литературном дневнике [Электронный ресурс] / Н. Гарбер. – Режим доступа : http://www.nataliagarber.ru/index.php?option=com_content&view=article&id=133:2012-10-11-03-57-27&catid=39:2009-10-05-20-01-10&Itemid=55. – Дата доступа : 13.10.2015.

3. Бозрикова, С. Особенности художественно-документального нарратива («Хладнокровное убийство» Т. Капоте и «101-й километр» М. Осипова) [Электронный ресурс] / С. Бозрикова – Режим доступа : http://www.academia.edu/3684644/_-_._101-_._. – Дата доступа : 12.09.2015.

4. Gutkind, L. What is Creative Nonfiction? [Электронный ресурс] / L. Gutkind. – Режим доступа : http://www.creativenonfiction.org/what-is-creative-nonfiction#author-biography. – Дата доступа : 15.10.2015.

5. Эпштейн, М. Парадоксы новизны. О литературном развитии Х1Х–ХХ вв. / М. Эпштейн. – М. : Советский писатель, 1988. – 416 с.

Центр исследований белорусской культуры,
языка и литературы им. Я. Купалы

Поступила в редакцию 02.12.2015

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (94), 2016

*УДК 811.161.3'373.2'271*

# Лёс: слова і канцэпт (спроба лінгвакультуралагічнага аналізу)

А.Д. Паўлавец, Д.Д. Паўлавец

Аналізуюцца асаблівасці выкарыстання канцэпту лёс у беларускай мове, яго роля ў нацыянальнай моўнай карціне свету, паказваецца яго шматзначнасць і разнастайнасць, суадносяцца філасофскае і міфапаэтычнае ўяўленне пра лёс як адзін з галоўных канцэптаў мовы.
**Ключавыя словы:** кацэпт, канцэпталогія, лёс і яго семантычны аб'ём, моўная карціна свету.

The features of the use of the concept of fate in the Belarusian language, its role in the national language picture of the world are analysed. Its ambiguity and diversity are indicated. Philosophical and mythopoetic idea of destiny as one of the main concepts of the language is studied.
**Keywords:** concept, concept logy, fate and its semantic volume, national language picture of the world.

Апошнім часам у навуковых колах не слабне, а нарастае цікавасць да канцэпталогіі і канцэпту. Пра гэта сведчыць паток даследаванняў, прысвечаных дадзенай праблеме, якія ахопліваюць кагнітыўную лінгвістыку, псіхалінвістыку, лінгвакультуралогію, літаратуразнаўства і іншыя навукі. Гэта пацвярджае думку пра актуальнасць і навуковую значнасць акрэсленага аспекту. «Канцэпт – гэта важная інфармацыя, якая захоўваецца ў індывідуальнай або калектыўнай памяці і валодае пэўнай каштоўнасцю, гэта перажываная інфармацыя» [1, с. 128]. Таму зварот да таго або другога канцэпту прадукцыйны і павучальны. «Кожная высокаразвітая мова мае шэраг слоў, акружаных глыбокай таямніцаю: лёс, рок, выпадак (здарэнне), прадвызначэнне. Ніводная гіпотэза, ніводная навука ніколі не зможа дакрануцца да таго, што мы адчуваем, калі заглыбімся ў сэнс і гучанне гэтых слоў. Гэта – сімвалы, але не паняцці» [ 2, с. 273]. Звернемся да аднаго з найбольш значных і складаных канцэптаў нацыянальнай моўнай карціны свету канцэпту лёс і прааналізуем яго ў аўтарскай і народнай канцэптасферы беларускай мовы. Пры гэтым неабходна памятаць, што «ідэя лёсу патрабуе жыццёвага досведу, а не навуковага вопыту, сілы сузірання, а не калькуляцыі, глыбіні, а не розуму» [ 2, с. 273].

Семантычны абсяг «лёсу» даволі шыроки і шматзначны. У ягоных межах апынуліся іншыя канцэпты, злучаныя з ім і адзін з другім, дзякуючы таму, што патрапілі ў поле ягонага прыцягнення. Гэты відавочна дамінавальны канцэпт утварае шмат новых сэнсаў, выясняе і адкрывае новыя светаразуменні ў творах мастацкай літаратуры. Пры гэтым і сам канцэпт эвалюцыянуе, мяняюцца яго межы, паняццевы аб'ём, нават сэнс, які нярэдка звязаны з аўтарскім светабачаннем, лёсам лірычнага героя. Змест ментальнай субстанцыі «лёсу», «долі» прываблівае і працягвае прываблівацъ да сябе ўвагу прадстаўнікоў розных галінаў ведаў. Аднак спецыфіка суб'екта, схаванага за назвай лёс, заключаецца ў тым, што інфармацыя пра яго не верыфікаваная, сам ён шматмерны і дапускае мноства інтэрпрэтацый, не існуе ў эміпірычным досведзе як нейкая рэальнасць.

Як і ў культурах іншых народаў, канцэпт «лёс», бадай, адзін з найгалоўнейшых канцэптаў беларускай культуры. Мусім зазначыць, што названы канцэпт прыцягваў і прыцягвае ўвагу даследчыкаў розных краін і розных галін ведаў, якія разглядаюць яго з лінгвакультуралагічнага і філасофскага бакоў, вызначаюць яго месца ў нацыянальнай моўнай карціне свету. Сапраўды, лёс – гэта найгалоўнейшая катэгорыя свядомасці, пры дапамозе якой будуецца канцэптуальная карціна свету народа. Лёс маюць усе: людзі, рэчы, з'явы, падзеі. Лёс – гэта боска ўсталяваная існасць і будучыня кожнай рэчы і кожнага чалавека, аднак гэта не разумная існасць; у рэлігійным сэнсе – гэта Бог. Слоўнікавыя дэфініцыі паняцця «лёс» сведчаць пра неадназначнасць яе разумення носьбітамі мовы. Прычына схавана ў самой лексеме лёс, разуменне якой найперш абапіраецца на эміпірычны характар.

Разуменне лёсу як найвышэйшай сілы адлюстравана ў Тлумачальным слоўніку беларускай мовы, ў якім за лексемай лёс замацаваны наступныя значэнні: 1. Ход падзей, якія складваюцца незалежна ад волі чалавека; збег акалічнасцей. 2. Доля. 3. Развіццё чаго-н.; далейшае існаванне, будучыня [3, с. 41]. «Беларуская энцыклапедыя» ў сваю чаргу паведамляе, што «лёс, у міфалогіі, ірацыяналістычных філасофскіх сістэмах, паўсядзённым усведамленні незразумелая, недаступная розуму, загадкавая прадвызначанасць падзей і ўчынкаў…у звычайным жыцці лёс азначае долю, жыццёвы шлях, збег абставін» [4, с. 231]. Як бачна, лёс інтэрпрэтуецца тут найперш як абстрактнае паняцце, як дзеянне ірацыянальнае, неспазнанае, таямнічае, як вобраз цёмнага пачатку, затым як нейкая несвабода, вынік учынкаў чалавека, нарэшце, як жыццё, збег абставін. «Міфалагічны слоўнік» разглядае лёс як «персаніфікацыю незалежнага ад волі чалавека ходу падзей, вырашальны збег акалічнасцяў, долю…можна меркаваць, што архаічны спосаб “сляпога” выбару-кідання, цягання, вылічэння, выбірання лёсаў (жараб'ёўка) і бачанне ў гэтым працэсе грознай праявы нейкіх надпрыродных сіл спрадзіла ўяўленне пра лёс як прадвызначанасць, долю, наканаванасць» [5, с. 288–289]. Такім чынам, з прыведзенага вышэй можна канстатаваць, што лёс – гэта нешта непазбежнае, прадвызначанае, недаступнае розуму і волі чалавека, загадкавае.

Лексіколагі, не заглыбляючыся ў сэнсава-філасофскую напаўняльнасць адзінкі (ды гэта і не іх задача), выбудоўваюць сінанімічныя рады, у якіх дамінантай выступае лёс. Так, М.К. Клышка змяшчае ў гэты сінанімічны рад семы доля, жыццё, наканаванасць, наканаванне (разм.); планіда, зорка, латарэя, кон (перан.); жытка (разм.) [6, с. 166]. С.М. Шведаў у адным шэрагу з лёсам ставіць словы фартуна, фатум, боская воля (царк.), доля, будучыня [7, с. 192]. На жаль, у Беларусі дагэтуль адсутнічае нацыянальны філасофскі слоўнік, таму цяжка гаварыць, што разумеюць пад лёсам айчынныя філосафы.

Такім чынам, дадзеныя тлумачальных, сінанімічных, міфалагічных слоўнікаў дазваляюць сцвярджаць, што канцэпт «лёс» асацыюецца ў свядомасці носьбітаў мовы з іншымі канцэптамі, матываванымі сіламі лёсу. Важна тое, што ў канцэпце лёс падкрэсліваецца момант прынцыповай незалежнасці волі чалавека ад яго пазіцыі ў адносінах да жыццёвых абставін і непазнавальнасці дэтэрмінавальных сіл лёсу, якія нараджаюць боязь, жах, яго наступствы. Лёс неаадольны, таму што ён успрымаецца нашымі продкамі як бязлітасны, жорсткі або спагадлівы, зайздросны.

Апісваючы канцэпт «судьба», Л.О. Чарнейка і В.А. Далінскі ўвялі паняцце гештальту абстрактнага імені, своеасаблівай маскі, якую апранае абстрактнае імя. Пад гештальтам яны падразумяваюць уяўленні носьбітаў мовы, схаваныя ў імені і раскрывальныя праз яго спалучальнасць. Падаецца, што назваць вобразы, уласцівыя моўнай свядомасці ўвогуле, – задача невырашальная, аднак у пэўным замкнёным коле мастацкіх тэкстаў іх можна вызначыць. Мастацкая свядомасць, мысленне або адкрывае новыя ўласцівасці, якія раскрываюцца праз прызму аўтарскага светапогляду, або падае новыя праекцыі ўжо вядомых. Дзякуючы нетыповай, унікальнай спалучальнасці семы лёс, раскрываюцца яе ўласцівасці, прымальныя беларускамоўнай свядомасцю як адпаведныя духу мовы. Зараз на падставе аналізу ўжывання лексемы лёс беларускімі творцамі паспрабуем паказаць, якія значэнні надаваліся яму рознымі аўтарамі і ў розныя перыяды.

Бадай, упершыню канцэпт лёс сустракаецца ў творчасці Ф. Багушэвіча, дзе ён асацыюецца з горам. Лірычны герой паэта што толькі не рабіў, каб адужаць гора, аднак з гэтага нічога не атрымалася (Склаў я гора ў тарбіну ды ў Мерыку адвёз, Думаў: тут або я згіну, або з гора будзе лёс). Стмаіўшыся, ён прыходзіць да сумнай высновы: Мусіць, Бог яго з душою разам возьме, разам даў.

У Я. Коласа лёс бывае розны, яго значэнне нярэдка ўдакладняецца, паглыбляецца пры дапамозе эпітэтаў. У адным выпадку – гэта былінка поля, кволая травінка (Людскі наш лёс – былінка поля, Пылок нязначны – наша доля); у другім – нейкая невядомасць, нявызначанасць, нешта хвалюючае, трывожнае (Міхал з Антосем воз прыбралі, Каня запрэглі, пастаялі У нейкім смутным разважанні, У настроі новым, хваляванні: Дарога, даль і лёс нязнаны Глядзяць няветла скрозь туманы). У гэтых радках межы канцэптуальнага поля лёс пашыраны за кошт паралеляў з дарогай, даллю. Дарога ж у беларускай міфалагічнай

традыцыі выступае медыятарам паміж сённяшнім і заўтрашнім. У трэцім – нешта пагрознае, няснае, што наганяе боязь, боская кара, дамоклаў меч. Такі эфект дасягаецца з дапамогай шэрагу эпітэтаў, якія ўзбагачаюць канцэпт аўтарскімі псіхалагічна-ацэначнымі адценнямі, асацыяцыямі, здаецца, яшчэ хвіліна і героя назаўсёды накрые бязлітасная снежная лавіна жыццёвай безвыходнасці (Яго (Міхала) цікавіць лёс уласны, Лёс пагражаючы, няясны, Зацята схованы, замкнёны, Бы кары цёмнае праклёны, Што кожны момант над табою Звісае страшнаю марою); у чацвёртым – гэта разлучнік (Мой мілы сын, мая Маруся! Нас разлучыў няўмольны лёс); у наступным – божы дар, прыродны талент народнага музыкі: (рад быў хлопчык: дар вялікі, Неспадзеўны то быў дар, А Сымону лёс музыкі Усміхаўся ў сонцы мар).

У моўнай стыхі У. Жылкі лёс мае выразнае рамантычнае аблічча: ён то бязлітасны, жорсткі кат, то халодная неміласэрная зброя (наш лёс, бы кат,з рукой забойнай, Бязлітасней рука каго? Ды ўмее вой адзін спакойна Без роспачы прыняць яго; лёс даручыў палашу, Моўчкі, даўно сцерагу); то шчаслівая будучыня, паспяховы шлях развіцця радзімы, вера ў яе адраджэнне (І веру радасна я болей, чым калі, У вялікі лёс і шлях радзімае зямлі: Асуджаны народ быліц дазнае сказ); то аб'яднальнік, ніт нацыянальна-вызвольных сіл, змагароў за лепшую долю народа (І адзін злучае лёс, Бо для роднай стараны Долі хочама без слёз); то Радзіма, якая даруе жыццё ( І быў-пагодлівы, харошы! Мой край мне лёсам і жыццём, Маім распешчаным дзіцём); то таемным, загадкавым уладаром (Існасць не ўнятна праяў: Загадкай дрэмле разлог, Тайнасці лёс захаваў, Далі сцяною аблёг); то мізэрнае, жабрацкае існаванне, супрацьпастаўленае рабскаму лёсу (Ляпей жабрачы лёс… Але не лёс раба); то шчаслівае напоўненае радасці жыццё (Згадаўся думцы кволы Шэлі, Ягоны светласпеўны лёс).

У паэзіі А. Гаруна лёс – гэта зашыфраванае чалавечае ўбоства, пакора, задаволенасць мізэрнымі дабротамі (Жыве спакойна вол пад тым ярмом сваім, намуляў карк. Мазолі, скрозь мазолі! Падкінуць сена жмут – яму й таго даволі. І лёс мізэрны свой не назаве благім).

У паэзіі Л. Геніюш лёс – разлучнік, які раздзяліў беларусаў, раскідаў па свеце (Лёс раскідаў нас па ўсіх канцох, ты ж адзін грудзьмі супроць нягодаў); не толькі душа, знітаваная з роднай прыродай, а і ўсё роднае, блізкае, што праходзіць праз сэрца паэткі (Душа мая – ніт, пераплецены з лёсам зялёных палеткаў і вёсак у далінах, душа мая-кветкі і сум на пакосах, і ястраба шпоны, і ўзлёт галубіны). Побач з лёсам паэтка нярэдка ўжывае сінонім доля, якому надаецца то значэнне калыскі беларускасці (О, зямля! Сноў сялянскіх калыска, беларуская наша доля); то палыновай горычы (Айчына – адвечнае слова з глыбінь з жыццём удыхнулі ў сэрцы. Долі палын і нядолі цяплынь і вернасць падзеям да смерці); то ўрачыстая песня нашай прадзедаўскай мове (Мова дзядоў маіх, мова мая, Гімн нашай долі пакутны і ўзнёслы). У гэтых радках асноўным кампанентам выступае нацыянальны склад думання аўтаркі, нацыянальная логіка светасузірання, перажываная інфармацыя.

Для А. Куляшова лёс – гэта рака дзяцінства Бесядзь, на якую ён глядзіць праз своеасаблівыя «акуляры» і якая персаніфікуецца з вытокамі ягонай паэзіі, самой паэзіяй, клапатлівай маці (Плыву па ёй (Бесядзі)! Як хлопчыку малому – Паслаў мне лёс блакітную раку – праз цёмны акіян яна дадому Вядзе мяне, як маці, за руку) ці размежавальнік (Між намі лёс правёў размежаванне: Вы – скрыжаванне рук, я – крокаў рух).

У У. Караткевіча лёс – дарога, пакручастая, цёмная (Я [іду] лугавою дарогай, Пакручастай і цёмнай, як лёс); або пагрозлівая ноч (Ноч, як лёс, дамам пагражае. Цёмнай злівай, слатой. Тугой); або Залатая клетка (Няма ў душы маёй праклёнаў, Няма на веях цяжкіх слёз.. Заставайся ў клетцы залачонай Ты сама абрала гэты лёс). У гэтых радках У. Караткевіч, абапіраючыся на народна-паэтычныя традыцыі, нагадвае жанчыне пра тое, што жыць у залатой клетцы, мець дастатак, багацце — не мець свабоды, волі. Тут дарэчы будзе нагадаць народныя выслоўі: Лепш на волі на голай ветцы, чым у няволі ў залатой клетцы. Лепш на свабодзе ў каморцы, чым у няволі ў залатой клетцы. У наступных радках праз адмысловы мастацкі ракурс лёс-бізун паэт асуджае беларускую пакорнасць і адначасова выказвае сваю любоў, спагаду да свайго народа. Аўтар паглыбляе лексічнае значэнне поля лёс з дапамогай элемента семы бізун, які ў беларускім фальклоры валодае дадатковым асацыятыўным адценнем сімвала грубай сілы, прымусу (Што горды здзек, што вольнай песні ўзлёт Для чарады, чый лёс – бізун агідны. Як мне любіць такі народ?. Няшчасны мой..

Улюбёны.. Ненавідны); або свінец, непад'ёмны цяжар: Растаплю я твае снягі, А іначай лёс, як свінец, Сконы радасці і тугі, І канец, сапраўды канец); або Вечнасць (ты вечнасць, лёс). У мове У. Караткевіча лёс можа быць адвечны, надзвычайны, нязбыты, няўмольны, светлы, усяўладны, чорны.

У паэзіі Н. Гілевіча лёс у адным радку асацыюецца і з Беларуссю, і з вечным болем, і з недаспяванай песняй (О, Беларусь! Мой лёс, Мой вечны боль, Мая невыспеваная давеку Песня!); гэта свавольнік, гарэза (Можна ўсё да апошняй драбніцы аддаць Ды яшчэ ўсміхнуцца свавольнаму лёсу); гэта жыццёвая мярэжа (калі з гурмой дзядзькоў сівабародых, Ахрышчаны ў тваіх празрыстых водах, Ён невад тут цягнуў, нібы свой лёс); або сімвал людской абыякавасці, чалавечай трагедыі рэпрэсаваных асаднікаў (Гляджу і думаю: які нялюдскі лёс асадніцкіх сядзіб!); нарэшце, нялёгкі жыццёвы шлях (Які цяжар, якая кара, Калі, спасцігшы лёс свой трудны, Ты сам суддзя, і сам-падсудны, І сам-падсуднага ахвяра!)

М. Стральцоў спалучае лёс з міфапаэтычным вобразам дрэва, выяўляючы такім чынам універсальную канцэпцыю жыцця (Дрэва кронай хістае, нада мной навісае, як лёс); з прыроднымі з'явамі (Вада асенняе крыніцы, Яе злавесныя агні, Калі пад вечар неба ніца Глядзіць з панурай глыбіні, – Мне нагадалі даўні лёс, Якога памяць ці жывая); нарэшце паэтычная творчасць (паэзія – лёс, а лёс бывае розны, і паэт па-рознаму прымае і нясе гэты лёс).

Нечаканую алюзію канцэпт набывае ў Я. Янішчыц, якая, размаўляючы са сваёй каляжанкай Хр. Лялько, даводзіць: А востры серп прабабкі, Хрысціна, гэта – лёс. Вядома, што ў беларускай міфалогіі серп сімвалізаваў «працяг» жняі, увасабляў яе жыццёвую сілу. У іншых радках – гэта чаканне (Пад купалам нябёс, Дзе голас, як літанне, Такі нам выпаў лёс: Суцэльнае чаканне); і нечакана з'яўляеца лёс – думнік, мысляр (Вось думнік-лёс, а скраю – леснічоўка І над парожкам зарыва рабін).

Інакшае ўяўленне пра лёс, яго канцэптуальнае разуменне ў творчасці паэтаў-эмігрантаў, вымушаных уцекачоў з роднай Беларусі. Мяняюцца яго межы, паняццевы аб'ём, сэнс, які непасрэдна звязаны з выгнанніцкім лёсам. Для Алеся Змагара – гэта бязлітасны руйнавальнік (О, дзікі лёс вайны! Знішчальнік ніў, загонаў! Спыні свой страшны шал!)

У Я. Золака канцэпт лёс – выгнаннік, бесхацінец, у якім адчуваецца цяжкі псіхалагічны настрой, непрыкаянасць, бяздомнасць (З краю роднага, з роднага дому, У чужы і няведамы край Мяне выгнаў мой лёс-пустадомак Сумаваць і павольна ўміраць). Тут паэт выказаў самыя запаветныя думкі кожнага чалавека, які апынуўся на чужыне: адарванасць ад Радзімы, беспрытульнасць. Для А. Салаўя – прадвеснік смерці (Давядзецца мне долу зваліцца, патрабуе пагібелі лёс). Для М. Сяднёва – хлус, манюка (Таго ўсяго няма – лёс нахлусіў паганы).

У творчасці асобных аўтараў канцэпт лёс персаніфікуецца з конам, радзей рокам. Кон у беларускай міфалогіі – увасабленне прадвызначанага вышэйшымі сакральнымі сіламі сусветнага парадку, у больш вузкім сэнсе – лёс чалавека, яго доля [5, с. 251]. Рок – Бог праўды, справядлівасці прадвечны Кон [5, с. 238]. Паводле В. Ластоўскага, Правечны Кон – гэта другая асоба славянскай Тройцы: «Ён даў усяму жывому законы жыцця, назначыў кон, долю і акрэсліў канец, скон. <> Правечны Кон даў права, закон людзям, звярам, птахам, полазам, рыбам, і наагул усяму, што жыве, родзіцца і памірае. Устаноўленыя ім законы вечны і непарушны» [8, с. 60]. Сімвалам Кона было сонца (У той жа момант Кон Правечны блакіт-кнігу ў высях неба разгарнуў…І агністыя пісмёны адамкнуў).

У канцэпце Кон Н. Арсенневай адчуваюцца песемістычныя ноткі болю па страчанай Радзіме, скрозь якія прабіваюцца ноткі веры ў светлы дзень вяртання на Бацькаўшчыну: (Блакітная, далёкая Радзіма, калісь – штодзённы хлеб, а сяння – толькі сон, мы вернемся, чакай, хай хворымі, старымі, а вернемся! Так дай нам Кон!) У другім выпадку канцэпт Божы Кон – адлюстроўвае веру ў Бога, які дапаможа ўваскрасіць наш край (Чакайце ж, верце, прыйдзе Ён, Вялікі Дзень, і ў нашу хату, пашле і нам нарэшце свята дзіўны, нязнаны Божы Кон). У наступных радках паэтка, хоць і ўдзячная свайму лёсу, але скрозь словы падзякі прабіваецца пачуццё ахутанай паэтычнай смугой настальгіі, невылечнага болю па страчанай Радзіме (Я дзякую табе за ўсіх, за ўсё, мой кон, хоць мо й нязвыклы ты людской падзякі).

Трагедыйнае светаадчуванне, бязлітасны збег абставінаў укладваюцца ў канцэпт кон М. Кавылём: Бацькоўскі дом пакінуў я даўно, Без жалю кон шляхі жарствою сцеле.

Калі само слова лёс у залежнасці ад кантэксту мае або станоўчую, або адмоўную, або нейтральную ацэнку, то яго сінонім рок утрымлівае толькі негатыўнае адценне. У паэзіі А. Гаруна рок – гэта прадвызначанасць, дараваная зверху, Богам, якую чалавек не здольны змяніць. Ён можа толькі быць удзячным Богу за яго і падпарадкоўвацца яго сіле на працягу ўсяго жыцця. Такім ён паўстае ў творах А. Гаруна (Пакуту Рок табе, шчасліваму, прызначыў, І ўдзячны за яе Вялікаму ты будзь. Мой сын, спачтаку мы падуладны пану Року – І ў гэта вер).

Слова рок вельмі рэдка сустракаецца ва ўзвышаным стылі, яго зусім няма ў народна-песеннай творчасці, слоўнікі літаратурнай мовы, на жаль, не фіксюць гэтую адзінку, якая ўзыходзіць да старажытнага ректи.

У беларускай культурнай свядомасці канцэпт «лёс» асацыюецца з наступнымі сэнсавымі радамі: доля, жыццё, наканаванасць, наканаванне, планіда, кон , рок, а ў індывідуальна-аўтарскай свядомасці гэтыя рады ўзбагачаюцца дадатковымі сэнсавымі адценнямі, якія пашыраюць звычныя значэнні. Гэта адбываецца таму, што «ў структуру канцэпта ўваходзіць усё тое, што і робіць яго фактам культуры – зыходная форма (этымалогія); сціснутая да асноўных прыкмет зместу гісторыя; сучасныя асацыяцыі; ацэнкі і г. д.» [9, с. 41]. Канцэпт «лёс» у розныя часы рэальны у сваіх розных модусах і іпастасях. Такім чынам, пра беларускі лёс нельга рабіць выснову толькі на падставе адной лексемы, аднаго паняцця, так як адпаведныя паняцці ў нашай мове размяркоўваюцца паміж значэннямі доля, рок, кон, наканаванне і іншымі. Лёс можа быць асабісты, балесны, бедака, варожы, высакосны, высокі, глыбінны, горкі, добры, другі, жабрачы, заняпалы, злы, зямны, крохкі, лёгкі, ліхі, мужны, мужычы, невядомы, непрыкаяны, няспраўджаны, нястомны, паганы, свой, светлы, скваплівы, Хрыстосаў, цяжкі, чалавечы, шчаслівы і г. д.

Адзначым, што сема лёс ужываецца пераважна ў літаратурнай мове. Магчыма, гэта тлумачыцца яе іншамоўным паходжаннем. Таму ў народнай мове часцей сустракаецца лексема доля, якая можа быць рознай: шчаслівай / нешчаслівай, добрай / злой, трагічнай / мілай, цяжкай / лёгкай, аднак яна не падобна да року. Горкая доля-нядоля – гэта супрацьпастаўленне адна з найгалоўнейшых апазіцый у мадэлі сусвету беларуса. У беларускім фальклоры шчаслівая доля называецца зоркай, нядоля ж – зорка злая, удзел горкі, бяздольны. Слова доля – гэта агульнаславянская адзінка, якая пацвярджаецца міфалагічнымі крыніцамі. Доля – гэта багіня шчасця, лёсу ў славянскай міфалогіі. Як сцвярджаецца: «Доля, доля-шчасце, адно з старых ўяўленняў-персаніфікацый, што міфалагічным спосабам тлумачыць прадвызначанасць чалавечага лёсу, яго разнастайнасць, шчаслівыя і нешчаслівыя яго вырашэнні. Паводле традыцыйных уяўленняў, чалавек надзяляецца доляй пры нараджэнні, прытым доляй яго надзяляе маці або найвышэйшыя сілы, якія сімвалізуе Бог» [5, с. 149]. Як бачна, тут падкрэсліваецца наканаванасць і разнастайнасць долі, яе адзінства, злучанасць з Богам.

У нашых продкаў лёсам кіравала богіня Мокаш, якая прала ніткі лёсу і, акрамя таго, апекавалася жаночым рукадзеллем. Ёй дапамагалі дзве сястры – Доля і Нядоля – нябесныя праллі, якія пралі нітку жыцця кожнага чалавека. Доля ўвасабляла шчасце, талань, Нядоля (Ліха) – гора, злыбеду. Доля – гэта тое, што дзеліцца на часткі, што чалавек атрымлівае пры нараджэнні. З часам чалавек асэнсоўвае сябе часткай / доляй цэлага. Аднак доля ў кожнага свая, таму што свет падзелены на долі, кожнаму дастаецца яго доля. Адбываецца ўплыў звонку. Доля не самстойная як кон, яна выпадае. Лексема доля ў сучасным беларускім маўленні амаль не сустракаецца ў свабодным словазлучэнні. А выкарыстоўваецца ў ідыёмах кшталту такая доля выпала, пакласці на чыю-небудзь долю.

Актуальнасць канцэпту для беларускай мовы пацвярджаецца існай сістэмай сінанімічнага раду, у якім, акрамя слова лёс, рэпрэзентаваны лексемы, тоесныя з'явам доля, жыццё, наканаванасць, наканаванне (разм.); планіда, зорка, латарэя, кон (перан.); жытка (разм.), фартуна, фатум, боская воля (царк.), доля, будучыня. Яны таксама ўключаюць у сябе паняцце непрадказальнасці, прадвызначанасці, незваротнасці, праўда, не ўсе дэфініцыі гэтага шэрагу цалкам тоесныя паміж сабой. Уяўленне пра лёс адносіцца да асноўных катэгорый нацыянальнай культуры, якія ствараюць глыбінны падмурак каштоўнасцяў, вызначаюцца чалавечым калектывам. Канцэпт лёс, рэдка прысутнічае ў міфалагічных, рэлігійных, філасофскіх і этычных сістэмах нашай культуры. Ён часцей за ўсё замяняецца тут сваямоўнай адзінкай доля. Якраз яна складае ядро нацыянальнай і індывідуальнай свядомасці.

Разглядаючы сінанімічны рад лексемы лёс, мы знаходзім варыятыўнасць ужыванння, якая абумоўлена стылёвай дыферэнцыяцыяй, семантычнай залежнасцю ад сітуацыі, калі адбываецца несвядомы, інтуітыўны выбар адпаведнага слова з усіх пададзеных тоесных адзінак. Аналізуючы прыведзены матэрыял, можна зрабіць выснову, што канцэпт лёсу рознавектарны, неадназначны. У ім знітавны ключавыя ідэі беларускай культуры.

**Літаратура**

1.Карасик, В.И. Языковой круг: личность, концепты, дискурс / В.И. Карасик. – М. : Гнозис, 2004. – 392 с.

2.Spengler, O. Der Untergang des Abendlandes. Umrisse einer morphologie der Weltgeschichte. Gestalt und Wirklichkeit. / O. Spengler. – C.H. Beck'sche Verlagsbuch–Handlung. München, 1920. – 615 S.

3.Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / Акадэмія навук БССР, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа ; пад агульнай рэд. акадэміка АН БССР К.К. Атраховіча ; рэдкалегія : А.Я. Баханькоў, П.М. Гапановіч (рэд. тома), М.П. Лобан, М.Р. Суднік. –Мінск : Галоўная рэдакцыя Беларускай савецкай энцыклапедыі, 1979. – Т. 3. – 672 с.

4.Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / Рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 1989. – Т. 9. – 560 с.

5.Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч ; рэдкал. : С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мн. : Беларусь, 2004. – 592 с.

6.Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. / М.К. Клышка ; пад рэд. Л.А. Антанюк. – 2-е выд., выпр.і дапоўн. – Мн. : Выш.шк., 1993. – 445 с.

7.Шведаў, С.М. Слоўнік сінонімаў беларускай мовы. / С.М. Шведаў – Мінск : Сучаснае слова, 2004. – 480 с.

8.Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі ; Уклад., прадмова і каментарыі Я. Янушкевіча. – Мн. : Беларускі кнігазбор,1997. – 512 с.

9. Степанов, Ю.С. Константы. Словарь русской культуры. Опыт исследования / Ю.С. Степанов. – М. : Школа «Языки русской культуры», 1997. – 824 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 04.01.2016

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (94), 2016

*УДК 811.162.1'367.625:811.112'367.625*

# Словообразовательный потенциал глаголов физического воздействия в составе фазовых деривационных парадигм (на материале русского и немецкого языков)

Т.И. Скоробогатая

Рассматриваются особенности деривационного потенциала глаголов физического воздействия в русском и немецком языках с учетом имеющего места взаимодействия единиц разных уровней. Глагольная лексика исследуемых языков анализируется в составе фазовых деривационных парадигм. Охарактеризованы синтетические и аналитические средства представления деривационной семантики глаголов физического воздействия. Сопоставительный анализ деривационных средств позволяет дать всестороннюю оценку различному соотношению полных и неполных номинативных рядов, выявить общие и специфические для каждого из языков деривационные значения и средства их выражения.
**Ключевые слова:** глаголы физического воздействия, номинативный ряд, деривационная парадигма, русский язык, немецкий язык, словообразовательное значение, деривационные сочетания.

The peculiarities of the derivational potential of the verbs of physical impact in Russian and German languages are considered, taking into account units of different levels of interaction. The verbal vocabulary of the languages under study is analyzed as a part of the phase derivational paradigms. Synthetic and analytical means of the word-formation semantics representation of the verbs of physical impact are characterized. The comparative analysis of the derivational means allows assessing varied correlation of complete and incomplete nominative sets, to identify general and specific for each language derivational meanings and means of their expressing.
**Keywords:** verbs of physical impact, nominative set, derivational paradigm, Russian language, German language, word-formation meaning, derivative collocations.

Разные лексемы обладают различными возможностями словопроизводства Известно, что глагол обладает наибольшим словообразовательным потенциалом [1], [2], [3]. Деривационный потенциал может выявляться в словообразовательной парадигме, словообразовательной цепочке, в словообразовательном гнезде. «Для словообразования существенны отношения, связывающие родственные единицы, т. е. такие, основа выявления и отождествления которых представляется эксплицитно. Эти основополагающие свойства так или иначе отражаются на связях производного слова не только с другими словами, но и отношениях с единицами других уровней» [4, с. 123]. На наш взгляд, наиболее полно деривационный потенциал при сопоставлении неблизкородственных языков (русского и немецкого) можно выявить в рамках ономасиологического подхода. Ономасиологический подход, рассмотрение деривации как процесса позволяет обратиться к различным способам представления содержания номинативных единиц и рассматривать их не изолированно, а в составе целых объединений деривационно родственных единиц различной структуры. «Деривационные структуры «берут за основу» словообразовательные, «дополняют» их словосочетаниями с той или иной степенью аналитизма, имеющими в своем составе родственные по корню слова» [4, с. 119]. Сопоставительно-типологические исследования неблизкородственных языков требуют учета межуровневых связей и отношений, процесса взаимодействия единиц разных уровней. При этом актуальным становится изучение связей мотивированных слов со словосочетаниями, различными типами аналитических конструкций. Таким образом, цель работы – охарактеризовать и сопоставить деривационный потенциал глаголов физического воздействия с учетом межуровневых связей. В данной статье в центре внимания оказываются объединения родственных единиц, принадлежащих к разным языковым уровням. В качестве сопоставления выбраны фрагменты глагольной составляющей отвербативных парадигм.

Своеобразной системой упорядочивания производных является фазовая парадигма глагола. По определению Е.Я. Титаренко, «фазовая парадигма (ФП) глагола – это совокупность всех производных глаголов противоположного вида одного производящего, каждое из которых составляет с исходным глаголом словообразовательную пару, имеет мотивационные отношения и выражает один из фазовых пределов. На тех же основаниях в ФП глаголов НСВ входят супплетивная видовая пара и глаголы НСВ, выражающие одно-многократные фазовые отношения (многократные, прерывисто-смягчительные и др.)» [5, с. 102]. В фазовой парадигме дериваты группируются вокруг мотивирующего глагола в строго определенном порядке. На наш взгляд, такое понимание и определение ФП может быть взято за основу и сопоставительно-типологического исследования с некоторыми существенными уточнениями. Во-первых, категория фазовости формально может быть представлена синтетическими единицами и аналитическими средствами – словосочетаниями, включающими в свой состав компоненты, деривационно родственные производящему глаголу. Например, префикс *за-* и словосочетания модели *начать (начинать)+производящий глагол* в русском языке, а полупрефикс *an-* и синонимичные конструкции типа *beginnen (anfangen) + zu + производящий глагол* в немецком языке выражают начинательность у производных глаголов. Во-вторых, при наличии тех или иных фазовых значений, не для каждого языка, например, немецкого, характерно противопоставление по виду на уровне морфем. Следовательно, фазовая парадигма далеко не всегда может быть ограничена совокупностью всех производных глаголов противоположного вида. В-третьих, понимание фазовой парадигмы только на уровне морфем, как единственных средств ее представления, противоречит, на наш взгляд, пониманию фазовости как универсальной категории, не учитывает межуровневые связи, а, следовательно, ограничивает общее «поле» сопоставления неблизкородственных языков.

Учитывая межуровневые связи, *фазовую парадигму* с точки зрения номинативной деривации можно определить как совокупность номинативных рядов с фазовыми значениями. Фазовая парадигма как совокупность номинативных рядов характеризуется разнообразием значений, что позволяет взять ее за основу сопоставления деривационного потенциала глаголов в русском и немецком языках.

Глаголы со значением «физическое воздействие на объект» в русском и немецком языках характеризуются различным деривационным потенциалом, что отражается в количестве отвербативов в составе парадигм исходных единиц. Исследуемые глаголы русского языка характеризуются парадигмами, в состав которых входят от 2 до 29 отвербативов, в то время как в парадигмы производных глаголов входят от 1 до 50 отвербативов. Например, парадигма глагола *массировать* имеет только 2 производные лексемы, глагола *рубать* содержит 4 производных, в то время как парадигма глагола *кусать* имеет 29 отвербативов. В немецком языке в деривационную парадигму глагола *brechen* ‘ломать’ входит 26 производных глаголов, деривационная парадигма глагола *dehnen* ‘тянуть’ ограничивается только 3 производными, глагол *lockern* ‘рыхлить, шатать’ является производящим только для одного производного, в то время как 50 производных глаголов образовано от *schlagen* ‘бить’.

Деривационные парадигмы глаголов физического воздействия в русском и немецком языках отличаются друг от друга также по способу образования отвербативов. Так, однословные производные в деривационной парадигме русского языка образованы префиксальным (84 %), суффиксальным (5 %), префиксально-суффиксальным (3 %), постфиксальным (6 %), префиксально-постфиксальным (2 %) способами. Однословные производные в деривационной парадигме немецкого языка представлены сложными словами (56 %), префиксальными (10 %) и полупрефиксальными (34 %) производными.

Немецкий язык за счет продуктивности словосложения обладает большим количеством однословных лексем. В русском языке композитам немецкого языка соответствуют либо словосочетания с наречиями, либо производные глаголы: *entzweibeißen* ‘перекусить пополам, раскусить’, *sich zurückbeugen* ‘наклоняться назад’, *hochbiegen* ‘отгибать под прямым углом’, *zusammenbinden* ‘связывать’, *herausbohren* ‘просверливать, высверливать’. Однако наличие большего числа префиксов в русском языке приводит к большому числу таких производных глаголов с разнообразными значениями, которые в немецком языке могут быть представлены

только словосочетаниями. Например, значение ‘совершение действия в течение некоторого времени’ в русском языке может быть выражено префиксом **по-** и синонимичным префиксу словосочетанием с компонентом **некоторое время** в качестве деривационного: *погрызть – грызть некоторое время, подолбить – долбить некоторое время, поскрести – скрести некоторое время.* В немецком языке данное значение представлено исключительно аналитическими средствами, такими, как наречия и наречные выражения, обозначающие незначительную протяженность во времени **(eine Zeitlang** ‘некоторое время; недолго’, **eine Weile** ‘некоторое время’, **einige Zeit** ‘некоторое время’**):** *помешать – мешать некоторое время – eine Zeitlang rühren, поскоблить – скоблить некоторое время - eine Zeitlang schabeln).* С помощью морфем в немецком языке не отражаются следующие значения: ‘распространение действия на все или многие объекты’ *(перецеловать – viele küssen),* ‘не полностью совершить действие, названное мотивирующим глаголом, не довести его до необходимой нормы’ (*недожарить – nicht zu Ende braten*), ‘действие, происходящее с небольшой интенсивностью время от времени’ *(постукивать – von Zeit zu Zeit klopfen)*, ‘многократность действия’ *(повязывать – zu schlingen pflegen),* ‘однократность действия’ (*пнуть – einen Tritt geben).*

